І ВУЧЫЦЦА,
І ВУЧЫЦЬ ІНШЫХ
У 60+ 7

ЗЯМЛЮ ЧАКАЕ
КЛІМАТЫЧНЫ
АПАКАЛІПСІС? 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 ВЕРАСНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 181 (29048)

ХРУСТКАЯ РАБОТА

Фота БелТА.

Гаворачы пра ўборку ўраджаю па краіне, нельга не згадаць капусту — любімую вітамінную агародніну ў нашым рацыёне. Некаторыя гаспадаркі аддаюць пад гэту папулярную культуру вялікія плошчы. Напрыклад, у сельгаспрадпрыемстве «Фірма «Кадзіна» Магілёўскага раёна пад яе адведзена 40 гектараў. Так што паляводу Аксане ЦЫМЛЯКОВАЙ *(на фота)* і яе калегам хрусткай работы гэтай восенню хопіць.

ЛІЧБА ДНЯ

48 %

плошчаў бульбяных палеткаў убралі на сённяшні дзень сельгасарганізацыі краіны. Гэта больш чым 13,5 тысячы гектараў. Усяго сёлета пад бульбу адведзена 27,7 тысячы гектараў. Па даных на 23 верасня, накапана 430,8 тысячы тон бульбы. У сярэднім з 1 гектара сёлета збіраюць 325,2 цэнтнера бульбы, гэта на 35,9 цэнтнера больш за леташні паказчык. Лідарам ва ўборцы другога хлеба з'яўляецца Віцебская вобласць, там на сённяшні дзень убрана 60,9 % плошчаў бульбы. Таксама ў гэтым рэгіёне самы высокі паказчык ураджайнасці — 404,5 ц/га. Крыху менш — 395,3 ц/га — збіраюць у Магілёўскай вобласці. Працягваецца ў гаспадарках краіны і ўборка цукровых буракоў.

КАРАТКА

• У Беларусі распрацоўваецца праграма па пераходзе ўсяго грамадскага транспарту ў буйных гарадах на электрычную цягу.

• Клоўнатэрапію пачнуць прымяняць ва ўстановах аховы здароўя Мінскай, Гомельскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцей.

• «Белтэлекам» запускае ўласны тэлеканал «Яснае TV» на беларускай і рускай мовах на базе тэлеканала «Мінск TV».

• Серыял «Чарнобыль», зняты па падзеях 1986 года на Чарнобыльскай АЭС, атрымаў тры ўзнагароды на цырымоніі «Эмі» ў Лос-Анджэлесе.

Цікавы праект

ХТО Ў ХАЦЕ ГАСПАДАР

Секлі дровы, майстравалі лаўкі і каталіся на лыжах па траве СТАР. 4

Пераможца абласнога этапу праекта «Уладар сяла» сям'я Мячкоўскіх.

Фота БелТА.

Разумныя грошы

Бабулі не хапае на патэльню,

або Пазычаць трэба з розумам

Маёй маці заўсёды ўсё цікава. Яна па-дзіцячы жыва дзівіцца ўсім тэхнічным навінкам, новым спажывецкім таварам, наогул усім новым. Таму яе заўсёды запрашаюць на розныя прэзентацыі, паказы, чаяванні і іншыя продажы рознага патрэбнага (або непатрэбнага) дабра. З любога такога паходу яна нясе дадому патэльні, падушкі і нават тэпцікі. Ну не можа адмовіць мая дарагая матуля практычна нікому. Бо грошы не галоўнае. Але ўжо год як яе не клічуць на такія тэматычныя вячоркі. А ўсё таму, што маці ўжо больш за 80 гадоў. Яна ім стала нецікавая, таму што на буйную куплю трэба браць крэдыт... СТАР. 7

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Завяршаецца падпіска на IV квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 - 763X

НА ВАРЦЕ ТЭХНАЛОГІЙ І БЯСПЕКІ

Старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА паведаміў Прэзідэнту аб рабоце вядучых прадпрыемстваў падпарадкаванай яму галіны. Сярод іх 558-ы авіярамонтны завод, Аршанскі авіярамонтны завод, «Тэхніка сувязі».

«Першае пытанне, як ідуць справы ў вашым ведамстве, што змянілася пасля таго, як вы ўзначалілі яго, на чым акцэнтуеце ўвагу. Літаральна ў некалькіх словах для таго, каб гэта не выглядала нейкай самасправаздачай ці справаздачай — не час. Прыйдзе час, заслухаем справаздачу па ВПК, абаронцы ў цэлым, войсках», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як рэалізуюцца даручэнні па ўзнаўленні дзейнасці існуючых прадпрыемстваў, выпуску новых і найноўшых узораў узбраення, якія здольныя сёння ствараць айчынныя спецыялісты.

Яшчэ адна праблема, якая хвалюе Прэзідэнта, — гэта ракетабудаванне. «Мы стварылі «сярэднюю» ракету (прыкладна 300 кіламетраў), размова ішла пра павелічэнне далёкасці, магутнасці гэтых ракет. І на аснове той базы, якая ў нас існуе, на аснове вопыту нашых партнёраў, перш за ўсё Кітайскай Народнай Рэспублікі, з якой мы актыўна супрацоўнічаем у галіне ракетабудавання, хацелася б ведаць, як тут прасоўваюцца пытанні і як вырашаюцца тыя задачы, якія былі пастаўлены?» — пацікавіўся кіраўнік краіны.

Ён адзначыў, што даклад Рамана Галоўчанкі не павінен гучаць як «бразганне зброяй». «Я гэтага цалкам не ўспрымаю, асабліва ў гэты гарачы час, асабліва ў Беларусі. Вы ведаеце, што ў фокусе ўвагі аказалася наша краіна асабліва ў сувязі з разрывам Дагавора аб ракетах малой і сярэдняй далёкасці», — пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь катэгарычна выступае супраць размяшчэння гэтых ракет у Еўропе.

«Я ўжо неаднойчы пра гэта казаў. Ніякага бразгання зброяй тут няма і быць не можа, — дадаў Прэзідэнт, — проста размова ідзе пра тое, што мы таксама, знаходзячыся ў гэтым катле, гэтым гарачым, можна сказаць, палітычным пункце, не можам не звяртаць увагі на забеспячэнне сваёй бяспекі».

Свет не стаў спакайнейшы, і Беларусь павінна прымаць пэўныя меры ў гэтай сувязі, лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА расказаў журналістам, што ў галіне рэалізуюцца некалькі кірункаў — праграмы развіцця ўзбраення, ваеннай тэхнікі ў інтарэсах беларускіх ваенных структур, пастаўкі на экспарт і праграмы развіцця самой галіны, мадэрнізацыі прадпрыемстваў у малых і сярэдніх гарадах — Оршы, Баранавічах, Барысаве, Лідзе.

«У кожным з іх ёсць нашы прадпрыемствы, якія патрабуюць увагі і развіцця. Таму Прэзідэнта, як Вярхоўнага галоўнакамадуючага, цікавілі такія пытанні рэалізацыі стратэгічных, прарыўных кірункаў развіцця менавіта айчынных сістэм узбраення, і ў цэлым сітуацыя па абаронным комплексе, сектары эканомікі. Яна дастаткова пазітыўная, як я ўжо казаў, задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця, якія стаяць перад прадпрыемствамі, выконваюцца. Праграма мадэрнізацыі рэалізуецца, паказчыкі знаходзяцца ў межах устаноўленых нормаў», — сказаў Раман Галоўчанка.

Сёння стабільна працуюць забяспечаныя заказамі авіярамонтныя заводы краіны. Складаная сітуацыя на пачатку года была на Аршанскім авіярамонтным заводзе. «У сілу вядомых прычын там прыйшлося нанова аднаўляць вытворчасць, нанова рыцягваць кадры, глядзець тэхналогіі, а самае галоўнае — шукаць заказы», — паведаміў старшыня Дзяржваенпрама. Цяпер завод больш чым у два разы нарасціў аб'ёмы выпуску прадукцыі. Аднаўляюцца верталёты не толькі для Беларусі, але і для Паўднёва-Усходняй Азіі, Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі.

У Беларусі 155 дзяржаўных і прыватных арганізацый маюць ліцэнзіі на від дзейнасці, звязаны з распрацоўкай ці вытворчасцю прадукцыі ваеннага прызначэння. Гэта і вялікія заводы, і малыя канструктарскія бюро. Па словах Рамана Галоўчанкі, на прадпрыемствах Дзяржваенпрама працуе больш за 15 тысяч чалавек. Усяго ў сістэме задзейнічана каля 30 тысяч чалавек. І гэта лічба расце, з'яўляюцца новыя прадпрыемствы, якія дынамічна развіваюцца і ажыццяўляюць высокатэхналагічныя распрацоўкі, запатрабаваныя ў Беларусі і за мяжой.

Марыя ДАДАЛКА.

НЕ АДЗІНАЯ, АЛЕ АСАБЛІВАЯ

Што сёння адбываецца ў Магілёўскай вобласці: як там справы з дысцыплінай, з укараненнем новых тэхналогій, як падрыхтаваны жывёлы да зімоўкі і колькі назапашана кармоў — гэтыя і іншыя тэмы былі на парадку дня сустрэчы Прэзідэнта з Леанідам Зайцам, старшынёй Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, і Міхаілам Русым, памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Магілёўскай вобласці.

Асаблівую ўвагу таксама аддалі пытанню аб грашовай дапамозе рэгіёну. Кіраўнік краіны папярэдзіў суразмоўнікаў, што ў складзе Беларусі не адна толькі Магілёўская вобласць. «Вы, як ніхто іншы, добра валодаеце сітуацыяй па краіне, таму што самі працавалі ва ўрадзе і разумееце, што тыя праблемы, якімі хварэе Магілёўская вобласць, — гэтыя ж хваробы характэрныя і для іншых абласцей», — сказаў Прэзідэнт.

Лідар дзяржавы падкрэсліў: Магілёўшчына і Віцебшчына — асаблівыя вобласці. І, зразумела, на іх трэба «глядзець своеасабліва», што і робіць Прэзідэнт. Але кіраўнік краіны бачыць праблемы і Гродзенскай, і Брэсцкай, і Гомельскай абласцей. «А ў Гомельскай, вы ведаеце, таксама праблем, на жаль, не менш, чым у Магілёўскай ці Віцебскай вобласці, таму давайце абмяркоўваць усе вашы прапановы і праблемы з пункту гледжання фінансавых магчымасцяў нашай Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Толькі пад абяцанні грошай не будзе, падкрэсліў ён. «Мы павінны бачыць дакладны разлік. Калі вы нешта ствараеце, мы павінны бачыць, калі вернуцца гэтыя грошы. І не толькі тыя, якія вам рэспубліка ці банкі змогуць даць, але вы павінны бачыць і вяртанне ўласных сродкаў. Гэта ж для вас вельмі важна», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Не менш, чым сумам, трэба аддаваць увагу і тэрмінам вяртання грошай. «Калі вы плануеце пазычыць грошы і вярнуць іх праз 15—20 гадоў, дык з вамі ніхто размаўляць не будзе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і дадаў, што трэба бліжэй да жыцця ўносіць прапановы.

Самы галоўны момант, калі вобласць атрымае падтрымку, — ад яе чакаюць штодзённай станоўчай дынамікі. Грошы павінны працаваць і даваць эфект у выглядзе падаткаў, вяртання крэдытаў, павышэння заробкаў жыхароў, вытворчасці прадукцыі і рэалізацыі яе на ўнутраным і знешнім рынках.

«Вось аснова нашага сённяшняга дыялогу па Магілёўскай вобласці. І ні ў якім разе не зыходзьце з прынцыпу — прасіце больш, усё роўна дадуць менш, — папярэдзіў Прэзідэнт. — І другое, менш бюракратыі. Калі вы бачыце, што заўтра ад гэтага можна нешта атрымаць, то трэба сёння гэта зрабіць. Не трэба адкладваць у доўгую скрыню. Трэба хутка рашаць гэтыя пытанні».

Марыя ДАДАЛКА.

❍У ТЭМУ

Па словах **Леаніда ЗАЙЦА, старшыні Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта**, на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам ішла размова пра стратэгічнае развіццё і тактычныя падыходы па падняцці эканамічнага развіцця вобласці і яе суб'ектаў гаспадарання.

«Прэзідэнтам дакладна пастаўлена задача — забяспечыць дынаміку эканамічнага росту Магілёўскай вобласці. Прапрацавана праграма з 2019 да 2025 года ва ўсіх раёнах Магілёўскай вобласці, якая накіравана на павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці таварнай масы, павелічэнне выручкі ад рэалізацыі прадукцыі, якая ў сваю чаргу дазволіць дасягнуць па выніках работы за 2020 год выхад на заробкі не менш за 1000 рублёў на аднаго працуючага», — канстатаваў Леанід Заяц.

Таксама парадку патрабуе кіраўнік краіны ў жывёлагадоўлі і раслінаводстве: выканання тэхналогій, ліквідацыі падзяжу жывёлы і безгаспадарнасці.

Працуе вобласць і над павышэннем інвестыцыйнай прывабнасці. Па выніках дзевяці месяцаў года прагназуецца прыцягнуць прыкладна 80 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове. Звычайна яны ідуць на прадпрыемствы свабоднай эканамічнай зоны Магілёва, якія экспартуюць сваю прадукцыю.

Разам з ключавымі міністэрствамі нашай краіны, старшынямі раённых выканаўчых камітэтаў, службамі вобласці актуалізаваны праграмы, якія датычацца развіцця паўднёва-ўсходніх рэгіёнаў Магілёўшчыны. Такое даручэнне даў Прэзідэнт падчас нарады ў жніўні ў Касцюковічах. Па словах Леаніда Зайца, падрыхтаваны праект Указа Прэзідэнта, які ўносіць дапаўненні ва Указ за 2015 год.

«З улікам асаблівасцяў развіцця паўднёва-ўсходніх тэрыторый падрыхтаваны ўсе нарматыўна-прававыя дакументы, вызначаны параметры, задачы, на якія павінен выйсці гэты рэгіён з 2019 да 2025 года. Гэта прадугледжвае і будаўніцтва новых вытворчасцяў, пашырэнне дзейнасці існуючых прадпрыемстваў, павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі расліна- і жывёлагадоўлі з выхадам на канкрэтныя паказчыкі, якія забяспечвалі б падняцце матэрыяльнага дабрабыту тых, хто пражывае на згаданых тэрыторыях», — паведаміў журналістам старшыня Магілёўскага аблвыканкама.

Праекты і рашэнні

Новы азотны комплекс ААТ «Гродна Азот» плануецца ўвесці ў 2025 годзе

Такую інфармацыю прэм'ер-міністру Беларусі Сяргею Румасу падчас яго рабочай паездкі ў Гродзенскую вобласць агучыў генеральны дырэктар гэтага акцыянернага таварыства Ігар БАБЫР.

На гіганце хімічнай вытворчасці нашай краіны прэм'ер-міністр азнаёміўся з вынікамі фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства і ходам рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. Цяпер ідзе актыўная работа адразу па некалькіх праектах, найбуйнейшы з якіх — будаўніцтва новага комплексу па вытворчасці азотных угнаенняў магутнасцю звыш 1,25 мільёна тон штогод.

— Сёлета мы абвясцілі конкурс на будаўніцтва вялікага азотнага комплексу. На сённяшні дзень у ім удзельнічаюць пяць кампаній з Азіі і Еўропы. Фінансаванне і тэхнічныя моманты абмяркоўваем з усімі кампаніямі і на гэты момант ацэньваем іх прапановы, — паведаміў Ігар Бабыр.

Да аналізу прапаноў далучыліся і кампаніі, якія спецыялізуюцца ў гэтай галіне.

Плануецца, што генеральны забудоўшчык вызначыцца да канца года, у 2020 годзе будзе падпісаны кантракт. Чакаецца, што сам комплекс будзе ўведзены ў эксплуатацыю ў 2025-м.

Будаўніцтва новага азотнага комплексу дасць магчымасць цалкам закрыць патрэбу ў карбамідзе на ўнутраным рынку нашай краіны, а таксама забяспечыць пастаянную прысутнасць на знешніх рынках.

Дарэчы, сёлета на прадпрыемстве запушчаны новы цэх на вытворчасці азотнай кіслаты і вадкіх угнаенняў. Паспяховая рэалізацыя гэтага праекта дазволіла павысіць гадавую магутнасць вытворчасці вадкіх угнаенняў з 750 000 тон да 1,2 мільёна тон. Разам з тым, выкарыстанне энергаэфектыўных тэхналогій дазволіла паменшыць затраты на вытворчасць прадукцыі.

На кантролі

УМОВЫ ДЛЯ АЙЧЫННЫХ ПАЛЯЎНІЧЫХ

А даходы — за кошт замежнага турызму

Па стане на пачатак года ў паляўнічых гаспадарках краіны налічвалася каля 40 тысяч асобін лася, 100 тысяч казуль, 34 тысячы аленяў (у тым ліку 23 тысячы высакародных). Аб гэтым нам расказаў начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандр КАЗАРЭЗ:

— Мы займаемся аднаўленнем колькасці розных відаў жывёлы. Напрыклад, за апошнія гады папуляцыя высакароднага аленя значна павялічылася. За грошы дзяржаўнай пошліны на права палявання кожны год мы закупляем каля паўтары тысячы асобін і селім іх у паляўнічыя ўгоддзі. Такім чынам, штогадовы прырост складае прыкладна 30—40 працэнтаў. Да таго ж, такі від палявання папулярны сярод замежных паляўнічых, якія прыязджаюць да нас.

Аляксандр Казарэз адзначыў, што прыбытковасць вядзення паляўнічай гаспадаркі ў арганізацыях сістэмы Мінлясгаса на сённяшні дзень дасягае 80 працэнтаў. Гэты паказчык знізіўся пасля таго, як у 2013 годзе ўвялі часовую забарону на паляванне на дзіка.

— Сёлета на пачатак сакавіка колькасць гэтага віду жывёлы склала каля 2300 галоў. У 2017 годзе ў гаспадарках краіны было здабыта прыкладна дзевяць тысяч, летась — больш за 7600, а сёлета інтэнсіўнасць адстрэлу склала каля 4000 тысяч, — расказаў Аляксандр Казарэз.

Павелічэнне даходу паляўнічых гаспадарак краіны адбываецца ў асноўным за кошт развіцця замежнага паляўнічага турызму. Летась выручка склала 847 тысяч еўра, паведаміў **начальнік упраўлення палявання і рыбалоўства Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Сяргей ЦЭБРУК:**

— Летась у краіне для прыкладна дзвюх тысяч замежных грамадзян было праведзена 838 тураў. Па выручцы сёлета мы набліжаемся да ўзроўню 2013 года, калі было шмат дзіка і масавых паляванняў. Тады БТПР зарабляла крыху больш за мільён еўра. Даходы арганізацыі ў 2018 годзе склалі 16,5 мільёна рублёў, з якіх 8,8 мільёна — ад паляўнічагаспадарчай дзейнасці. Суадносіны даходаў ды выдаткаў склалі 126 працэнтаў. Гэта сведчыць аб тым, што амаль усе нашы гаспадаркі з'яўляюцца самаакупнымі.

Сяргей Цэбрук адзначыў, што асноўная задача на сённяшні дзень — стварэнне добрых умоў для палявання беларускім грамадзянам. Таму на працягу пяці гадоў цэны на загоннае паляванне не мяняюцца. Сёлета павышаць кошт таксама не плануецца.

Сёлета дзяржінспектары выявілі 639 парушэнняў у сферы палявання. Пра гэта паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення аналізу і кантролю за аховай і выкарыстаннем аб'ектаў жывёльнага і расліннага свету Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі Сяргей ШКАТУЛАЎ:**

— У 66 выпадках распачатыя крымінальныя справы за незаконную здабычу дзікіх жывёл з прычыненнем буйной або асабліва буйной шкоды. У 17 выпадках заведзены крымінальныя справы за незаконную транспарціроўку жывёл. Акрамя таго, у бягучым годзе ў парушальнікаў канфіскавалі 284 адзінкі агнястрэльнай зброі, з якіх 122 не былі зарэгістраваныя. Таксама былі канфіскаваныя петлі, пасткі і іншыя прылады палявання — усяго 312 адзінак. На браканьераў накладзена штрафаў больш чым на 106 тысяч рублёў.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Надвор'е

Сонечна, але ўжо без цяпла

А ў нядзелю на паўднёвым захадзе — да плюс 20 градусаў

На працягу ўсяго тыдня ў нас будзе холадна. А ўсё таму, што на тэрыторыю краіны зробіць набег скандынаўскі антыцыклон. Адно добра — на працягу гэтых дзён будзе практычна без дажджоў, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Аднак антыцыклон прынясе і суперхалодныя ночы. У гэты час пры ясным небе чакаюцца замаразкі. У канцы рабочага тыдня на поўдні краіны адаб'ецца ўплыў больш цёплай і вільготнай паветранай масы, а ў выхадныя дні атмасферныя франты, якія ссоўваюцца з боку Заходняй Еўропы, абумовяць кароткачасовыя дажджы.

Ужо заўтра ўдзень будзе пераважна без ападкаў. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца замаразкі да мінус 3 градусаў, месцамі тэмпература паветра складзе 1—6 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, па паўднёвым захадзе — 16—17 цяпла. Таксама будзе практычна суха і ў чацвер, толькі па паўднёвым захадзе краіны ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, месцамі, у асноўным па паўночным усходзе краіны, магчымыя замаразкі да мінус 3 градусаў, удзень будзе 10—16 цяпла. У паўднёва-заходніх раёнах краіны будзе значна цяплей: уначы — ад плюс 9 да плюс 10 градусаў, удзень — 17—18 цяпла.

У пятніцу, 27 верасня, будзе таксама пераважна без ападкаў, толькі па поўдні краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 10 градусаў, месцамі, у асноўным па паўночным усходзе краіны, магчымыя замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень будзе ад плюс 11 да плюс 18 градусаў.

Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, у суботу надвор'е пагоршыцца. А ўсё таму, што атмасферны фронт абумовіць уначы і раніцай па захадзе, удзень — на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 цяпла, па ўсходзе месцамі магчымыя замаразкі да мінус 2 градусаў, удзень будзе ад плюс 12 да плюс 18 градусаў. Па паўднёвым захадзе краіны ноччу чакаецца 9—10 цяпла, удзень — ад плюс 19 да плюс 20 градусаў. У нядзелю месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 5—12 цяпла, а ўдзень будзе ад плюс 13 да плюс 18 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны — нават да плюс 20 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

БАТАРЭІ ПАЧАЛІ НАГРАВАЦЦА

У сталічных дзіцячых садках. Пра гэта паведамілі ўчора ў Мінгарвыканкаме. Чакаецца, што з сённяшняга дня цяпло пачнуць даваць і ў сталічнае жыллё, і на працягу пяці дзён усе кватэры Мінска павінны нагрэцца.

Пацяплела ўчора і ў сацыяльных аб'ектах Віцебскай вобласці. Уключаць ацяпленне ў жыллі тут пакуль не плануюць і падкрэсліваюць, што ўлады кожнага раёна будуць прымаць рашэнне аб пачатку ацяпляльнага сезона самастойна, зыходзячы з умоў надвор'я.

Цяпло прыйшло і ў дзіцячыя садкі, школы і бальніцы Магілёўшчыны. Адпаведнае рашэнне тут прынялі мясцовыя ўлады. А з сённяшняга дня плануюць даць цяпло ў сацыяльных аб'ектах Гродзенскай вобласці. Як адзначылі ў аблвыканкаме, усе аб'екты ЖКГ і сацыяльнай сферы вобласці атрымалі пашпарты гатоўнасці да ацяпляльнага перыяду.

Тым не менш, як паведаміў **прэс-сакратар Мінжылкамгаса Генадзь АКСЦІЛОВІЧ,** пакуль у міністэрства не паступала афіцыйнай інфармацыі пра падключэнне цяпла ў краіне.

Тэмпература паветра праз некалькі халодных дзён мінулага тыдня ў кватэрах ужо апусцілася да 17 градусаў і ніжэй, аднак гэта не значыць, што яна не адпавядае дапушчальным крытэрыям.

— 18 градусаў — норма цяпла ў кватэрах у ацяпляльны перыяд, а ў міжацяпляльны перыяд нормы не існуе, — адзначыў Генадзь Аксціловіч.

Нагадаем, што прыняць рашэнне аб пачатку ацяпляльнага сезона ў жыллёвым фондзе мясцовыя органы ўлады ў адпаведнасці з ТКП 388-2012 маюць права, калі на працягу пяці дзён запар сярэднясутачная тэмпература складае не больш за восем градусаў.

Першымі, як заўжды, падключаюць цяпло ў дзіцячых садках, школах, бальніцах, музеях, дзяржаўных архівах, бібліятэках. Батарэі тут павінны награвацца, калі сярэдняя тэмпература пяць сутак трымаецца на ўзроўні +10. У наступную чаргу «ўключаюць» жылыя дамы, інтэрнаты, гасцініцы, навучальныя ўстановы, басейны, лазні і тэатры. Трэцяя катэгорыя аб'ектаў: адміністрацыйныя будынкі і прадпрыемствы атрымліваюць цяпло самыя апошнія. Пры ўмове, што яны маюць пашпарты гатоўнасці або акт праверкі гатоўнасці да работы ў асенне-зімовы перыяд і пасля пачатку ацяплення ў жыллі.

Ірына СІДАРОК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША ўзмацняюць ваенны кантынгент на Блізкім Усходзе

Злучаныя Штаты абяцаюць перакідваць на Блізкі Усход дадатковыя войскі і ваенную тэхніку для размяшчэння ў Саудаўскай Аравіі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Па словах кіраўніка ваеннага ведамства Маркa Эспера, такім чынам ЗША адрэагавалі на ўдар з выкарыстаннем беспілотнікаў па нафтавых прадпрыемствах Саудаўскай Аравіі. «Гэта першы крок, які мы робім у адказ на гэтыя атакі для таго, каб дапамагчы ўмацаваць абарону Саудаўскай Аравіі, даць тэхніку як Саудаўскай Аравіі, так і ААЭ. Па-другое, мы робім гэта, каб забяспечыць свабодны гандаль праз праліў. І, нарэшце, па-трэцяе — наша задача абараняць сусветны парадак, заснаваны на правілах. Гэта яшчэ і спроба пераканаць іранцаў вярнуцца на шлях дыпламатыі», — адзначыў Эспер. Пры гэтым ён запэўніў, што ЗША не жадаюць ваяваць з Іранам. Узмацненне носіць абарончы характар, амерыканскія войскі будуць у асноўным адказваць за супрацьпаветраную і супрацьракетную абарону. Па словах кіраўніка Камітэта начальнікаў штабоў Узброеных сіл ЗША генерала Джозэфа Данфарда, гаворка ідзе аб сотні салдат, але не аб тысячах.

У Албаніі зафіксавана каля 300 падземных штуршкоў

297 падземных штуршкоў зафіксаваныя на тэрыторыі Албаніі за суткі, паведамляе ТАСС са спасылкай на паўночнамакедонскае інфармацыйнае агенцтва МІА. Больш за ўсё пацярпелі сталіца Албаніі Тырана, горад Дурэс, размешчаны на ўзбярэжжы Адрыятычнага мора, а таксама населеныя пункты Паградэц, Фіеры і шэраг гарадоў у паўднёва-заходняй частцы Паўночнай Македоніі. Серыя землятрусаў, якія сталі найбуйнейшымі ў краіне за апошнія 30 гадоў, выклікала паніку ў насельніцтва, людзі пачалі пакідаць дамы. Жыхары Тыраны і Дурэса правялі ноч на вуліцах, а таксама ў шасці спецыяльна арганізаваных цэнтрах. Паводле апошніх даных, пацярпела звыш 100 чалавек. Паведамляецца пра 569 пашкоджаных будынкаў, у тым ліку школы, медыцынскія цэнтры і жылыя дамы, паведамляе выданне Albanian Daily News. У шэрагу населеных пунктаў краіны была адключана электрычнасць, адсутнічала мабільная сувязь. Паліцыя прыведзена ў поўную гатоўнасць.

У Іспаніі адзначылі 500-годдзе першага кругасветнага плавання

Урачыстая цырымонія прайшла ў порце Санлукар-дэ-Барамеда. На ваду быў спушчаны вянок у памяць аб тых, хто з гістарычнага плавання не вярнуўся. З гэтага порта ў 1519 годзе на чале з партугальскім мараплаўцам Фернанам Магеланам выйшлі судны «Трынідад», «Сан-Антоніа», «Сант'яга», «Кансэпсіён» і «Вікторыя». Як і Калумб, Магелан верыў у тое, што зямля круглая, і падарожжа на захад прывядзе на ўсход. Флатылія прайшла ўздоўж атлантычнага ўзбярэжжа Паўднёвай Амерыкі, абагнула Новы Свет з поўдня па праліве, цяпер ён вядомы як Магеланаў, і выйшла ў Ціхі акіян. Магелан загінуў у сутычцы з месцічамі на Філіпінскіх астравах. Падарожжа 6 верасня 1522 года завяршыла толькі «Вікторыя» пад камандаваннем Хуана Себасцьяна Элькана. Прывезеныя вострыя прыправы акупілі страту астатніх суднаў.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

СУМА НА ЎТРЫМАННЕ ШКОЛЬНІКАЎ ПЕРАГЛЕДЖАНА

З 2020 года ў Беларусі павялічацца нарматывы выдаткаў на аднаго навучэнца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

Згодна з пастановай Савета Міністраў ад 18 верасня 2019 года № 629, уносяцца змяненні ў Палажэнне аб планаванні выдаткаў мясцовых бюджэтаў на фінансаванне дзяржустаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Для школ, размешчаных у гарадах, пасёлках гарадскога тыпу, нарматывы на навучанне і выхаванне аднаго школьніка вырастуць да 1954,8 рубля ў год, у сельскіх населеных пунктах — да 4463,87 рубля. Раней нарматывы складалі 1667,92 і 3808,76 рубля ў год адпаведна.

Нарматыў уключае выдаткі на рэалізацыю адукацыйных праграм агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, у тым ліку выдаткі на аплату працы педагагічных работнікаў, выхадныя дапамогі, камандзіроўкі, аплату сувязі, транспартных паслуг, іншыя бягучыя выдаткі.

Таксама перагледжаны карэктуючыя каэфіцыенты, якія прымяняюцца да нарматыву выдаткаў на навучанне і выхаванне аднаго навучэнца ў залежнасці ад размяшчэння ўстановы адукацыі, яе тыпу, колькасці навучэнцаў, наяўнасці/адсутнасці басейна, магчымасці наведваць групу падоўжанага дня і іншых абставін.

Асноўныя палажэнні пастановы набудуць сілу 1 студзеня 2020 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

УСЮ ВОСЕНЬ НА МАНЕЖЫ

Гран-пры II Мінскага міжнароднага фестывалю цыркавога мастацтва, што праходзіў 19—22 верасня, атрымалі артысты з Расіі — атракцыён з белымі тыграмі «Шамбала» пад кіраўніцтвам Сяргея Несцерава.

circus.by.

Золата — у паветранага эквілібра «Віртуозная пяцёрка» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Плотнікава (Расія) і «Канатаходцаў» з Нацыянальнага цырка Пхеньяна (КНДР). Сярэбраныя ўзнагароды фестывалю дасталіся ўкраінскім паветраным гімнастам у кольцы Марыне Главацкіх і Аляксею Грыгараву, а таксама акрабатам на сустрэчных арэлях з Расійскай дзяржаўнай цыркавой кампаніі (нумар «Вышэй за аблокі» пад кіраўніцтвам Алякандра Скокава). У ліку бронзавых прызёраў — беларускія гімнасткі на трапецыі Анастасія Дончанка і Анастасія Пуцята з Белдзяржцырка, нумар «Свабодны дрот» кітайскага артыста Лі Вэй, акрабаты на «Пераходнай лесвіцы» з Казахскага дзяржаўнага цырка і сола-эквілібрыст на палках Раман Хаперскі з Маскоўскага цырка Нікуліна на Цвятным бульвары. Раздалі свае прызы таксама журы: глядацкае, грамадскае і дзіцячае, а расійскі атракцыён «Забаўныя мядзведзі» пад кіраўніцтвам Таццяны і Андрэя Яравых атрымаў асобную ўзнагароду старшыні Мінгарвыканкама.

Нагадаем, сёлета ў мінскім фестывалі ўзялі ўдзел каля 100 артыстаў з 18 краін свету, а ацэньвалі прадстаўленыя ва ўсіх жанрах нумары прафесіяналы — аўтарытэтныя прадзюсары, рэжысёры, дырэктары сусветна вядомых цыркаў. Найлепшыя, па версіі суддзяў і гледачоў, выступленні будуць уключаны ў новую праграму «Брава!», якая пачнецца ў Белдзяржцырку ўжо з 27 верасня і будзе паказвацца да 8 снежня.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

АЎТАКРАН УПАЎ У КАТЛАВАН

А 21-й гадзіне сталічным ратавальнікам паступіла паведамленне пра падзенне аўтамабільнага крана на вуліцы Караля.

Калі падраздзяленні МНС прыбылі да месца выкліку, было ўстаноўлена, што ў 18.30 пры правядзенні работ па перамяшчэнні металічнай апалубкі на тэрыторыі будаўніцтва трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна адбылося падзенне аўтамабільнага крана ў катлаван глыбінёй 25 метраў. У выніку пацярпеў машыніст аўтакрана, які, знаходзячыся ў кабіне кіравання, у момант падзення выскачыў у катлаван. З папярэднім дыягназам «пералом» ён быў дастаўлены ў бальніцу.

Механічныя пашкоджанні атрымалі аўтакран і часовы ўпор для стабілізацыі сцяны катлавана. Прычына здарэння высвятляецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Свята

На лідарскіх пазіцыях

Гродзенская вобласць адзначыла 75-годдзе з моманту свайго ўтварэння

Урачыстае мерапрыемства, што прайшло ў мінулую пятніцу ў абласной філармоніі, сабрало больш за тысячу гасцей. У тым ліку свята наведалі прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас і намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Мікалай Снапкоў, які зачытаў прывітальны адрас ад кіраўніка дзяржавы.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ *(другі злева)* уручыў пасведчанні аб занясенні ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці: Генрых ФЕДАСЕВІЧ, які прысвяціў шмат гадоў працы ў аграрнай галіне рэгіёна, дырэктар, мастацкі кіраўнік і дырыжор заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь ДУК «Гродзенская капэла» Уладзімір БОРМАТАЎ, прызёр Параалімпійскіх гульняў, чэмпіён свету і Еўропы па інваспорце Аляксандр ТРЫПУЦЬ.

Ганаровыя госці акцэнтавалі ўвагу на дасягненнях і поспехах самай малой па памерах вобласці, працавітасці яе жыхароў.

— Гродзеншчына валодае ўнікальнай гісторыяй і багатай культурнай спадчынай, вялікім чалавечым патэнцыялам. Дзякуючы працы і любові да роднай зямлі кожнага з вас вобласць займае лідарскія пазіцыі па шэрагу кірункаў і знаходзіцца ў авангардзе пазітыўных пераўтварэнняў у эканоміцы і сацыяльнай сферы, — адзначыў Сяргей Румас.

Ён падкрэсліў, што Прынёманскі рэгіён вядомы сваёй культурай земляробства і робіць значны ўнёсак у харчовую бяспеку Беларусі. Сёлета ў вобласці атрымалі самы высокі ў краіне ўраджай збожжа — 1200 тысяч тон, тэмпы росту вытворчасці малака значна вышэйшыя, чым у сярэднім па краіне. Але, на думку высокага госця, самы вялікі здабытак рэгіёна — гэта людзі, якія добрасумленна працуюць на карысць свайго краю.

Таксама прэм'ер-міністр акцэнтаваў увагу на задачах, што стаяць сёння перад вобласцю:

— Перш за ўсё гэта мадэрнізацыя і якаснае абнаўленне вытворчасці, падтрымка бізнесу і прадпрымальніцкай актыўнасці грамадзян, прыцягненне буйных інвестыцый у прамысловасць, сельскую гаспадарку і турызм.

Шмат чаго яшчэ неабходна зрабіць, на яго думку, і для стварэння сучасных рабочых месцаў, павышэння якасці і ўзроўню жыцця людзей.

— Без прыхільнасці да сям'і і сяброў, роднага краю, любімага горада ці пасёлка немагчыма далейшае развіццё. Упэўнены, што вы і надалей будзеце плённа працаваць на карысць сваёй малой радзімы. А значыць, будуць у гісторыі рэгіёна новыя перамогі, новыя вяршыні, дасягненні, новыя славутыя імёны, — падкрэсліў Сяргей Румас.

Вялікая колькасць цёплых слоў і пажаданняў прагучала ў гэты дзень у адрас Гродзеншчыны ад шматлікіх гасцей, сяброў і замежных партнёраў вобласці.

Падчас урачыстага мерапрыемства выдатныя жыхары Прынёмання атрымалі свае заслужаныя ўзнагароды. Кнігу гонару Гродзеншчыны папоўнілі імёны Уладзіміра Борматава — дырэктара, мастацкага кіраўніка заслужанага калектыву Беларусі «Гродзенская капэла», Аляксандра Трыпуця — прызёра Параалімпійскіх гульняў, чэмпіёна свету і Еўропы па інваспорце, Генрыха Федасевіча, які доўгі час працаваў у аграрнай галіне Прынёмання.

Фота БелТА.

Афіцыйную частку ўрачыстасцяў працягнуў вялікі святочны канцэрт з удзелам мясцовых і сталічных артыстаў. Самым яркім падарункам стала выступленне народнага артыста Беларусі Анатоля Ярмоленкі, які прысвяціў усім жыхарам вобласці песню «Добрыя людзі». Ён прызнаўся, што яны і ёсць тыя людзі, з якімі «так светла ў свята і ў будзень».

Вольга АНУФРЫЕВА.

ХТО Ў ХАЦЕ ГАСПАДАР

Весела, з жартамі, песнямі, танцамі прайшоў Мінскі абласны этап рэспубліканскага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла». Гэтым разам госці сабраліся на гасціннай Любанскай зямлі. Гаспадары пастараліся, каб удзельнікі конкурсу адчувалі сябе як дома. Спаборніцтвы праходзілі ў гарадскім парку культуры і адпачынку. Гэтае прыгожае, уладкаванае месца карыстаецца ў жыхароў райцэнтра і раёна асаблівай папулярнасцю.

За званне самых працалюбівых, крэатыўных, творчых змагаліся сямнаццаць маладых сем'яў з розных куткоў Міншчыны. Сярод удзельнікаў — сем'і механізатараў, жывёлаводаў, трактарыстаў, кіроўцаў, леснікоў, паштальёнаў, настаўнікаў і нават урачоў, якія жывуць і працуюць у сельскай мясцовасці.

— У гэтым праекце кожны год бяруць удзел абсалютна розныя сем'і. Абавязковая ўмова конкурсу, каб сужэнцы мелі дзяцей і хтосьці з бацькоў працаваў у сельгасарганізацыі, — расказаў **першы сакратар абласной арганізацыі БРСМ Кірыл ШЫК.** — Гэты конкурс паказвае, наколькі таленавітыя ў нас людзі. У кагосьці музычныя здольнасці, у некага — геаграфічныя, этнаграфічныя, танцавальныя. Удзельнікі могуць паказаць асаблівасці і традыцыі сваіх мясцовасці, населенага пункта. У тым ліку і ўнікальнасць кулінарных рэцэптаў, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне і да гэтага часу захоўваюцца нашчадкамі.

Нездарма мерапрыемства пачалося з абходу кампетэнтным журы імправізаваных сельскіх падворкаў. Кожны з іх багаты на розныя пачастункі. На сталах — нацыянальныя стравы: драні кі, свойскія каўбасы, сала, аладкі, верашчака, хатнія нарыхтоўкі, сучасныя модныя закускі. А якія напоі! Медавуха, квас, морс з журавін. Гаспадары гасцінна запрашаюць пачаставацца ўсіх ахвотных. Але, бадай, найбольш здзівіла прысутных сям'я Баўкуновічаў са Старых Дарог, якія прапанавалі аж трыццаць страў, прыгатаваных з прадуктаў асабістай гаспадаркі. Муж і жонка трымаюць курэй, бычкоў, качак. Вядома, гаспадарам было б цяжка спраўляцца з хатнімі клопатамі. Але ў сям'і падрастаюць надзейныя памочнікі —дзеці Максім і Паліна. У кожнага з іх свае абавязкі.

За званне самых працалюбівых, крэатыўных, творчых змагаліся сямнаццаць маладых сем'яў з розных куткоў Міншчыны. Сярод удзельнікаў — сем'і механізатараў, жывёлаводаў, трактарыстаў, кіроўцаў, леснікоў, паштальёнаў, настаўнікаў і нават урачоў, якія жывуць і працуюць у сельскай мясцовасці.

У Наталлі і Сяргея Кукрашаў з вёскі Крукава Любанскага раёна — коні, авечкі, козы, парсюкі, куры, трусы. І нават такія экзатычныя гадаванцы, як фазаны, паўліны. З сабой на конкурс сужэнцы прывезлі любімiцу сям'і — в'етнамскага парсючка Нюшку, якая гуляе з дзецьмі, нібы шчанюк. Свінка нарадзілася кволай, маці адмовілася прыняць немаўля. «Дзіця» выходжвалі ўсёй сям'ёй, паілі малаком з соскі, пасялілі ў доме ў спецыяльнай каробцы.

Надзвычай захапляльнымі сталіся спаборніцтвы дрывасекаў. Сямейным парам прапаноўвалася распілаваць бервяно на тры часткі, а затым раскалоць яго на дровы. Варта было пабачыць, з якім імпэтам спраўляліся з заданнем мужчыны, — толькі трэскі ляцелі ў розныя бакі. А іх спадарожніцы збіралі гатовую прадукцыю і як найхутчэй імкнуліся скласці яе ў акуратныя кастры.

А ці зможаце вы, паважаныя чытачы, з пяці дошак змайстраваць лаўку, ды такую, каб вытрымлівала не толькі гаспадара, але і гаспадыню? А вось удзельнікі конкурсу «Лаўкачы» і тут паказалі сваё ўменне і спрыт. Лаўкі атрымаліся трывалыя.

Падчас інтэлектуальных гульняў удзельнікі прадэманстравалі выдатныя веды, кемлівасць. Большасць пытанняў датычылася прымавак, розных народных выказванняў, баек. Напрыклад, да якой падзеі павінна зажыць рана? Вядома, да вяселля.

Сапраўдным сюрпрызам стала і спартыўна-гумарыстычная эстафета. Падрыхтавацца да яе нельга было загадзя, паколькі заданне прапаноўвае прымаючы бок. Весела было назіраць, як мужчыны вазілі сваіх жонак на тачках, перакочвалі мяхі з бульбай. Ну і вядома, каталіся на адной пары лыжаў разам. Хтосьці падаў, спатыкаўся, але імкнуўся дайсці да фінішу.

Нялёгка было журы вызначыць пераможцаў. Усе без выключэння паказалі спрыт, упартасць у дасягненні мэты, працавітасць, фантазію і творчасць. Але суддзі прыйшлі да высновы, што найлепшая сярод усіх — сям'я Пятра і Вольгі Мячкоўскіх з ААТ «Лебедзева» Маладзечанскага раёна. Пётр працуе ўрачом-анестэзіёлагам, Вольга — эканамістам. Сужэнцы выхоўваюць трох сынаў — Гардзея, Германа і Радзівона. Сям'я прадставіць Міншчыну ў фінале рэспубліканскага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла — 2019», які пройдзе 28 верасня ў аграгарадку Ракаў Валожынскага раёна.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

● У тэму

КОНТУРЫ ВОБЛАСЦІ Ў КАРЦІНЕ НІТКАМІ

Выдатную работу спецыяльна да святкавання 75-годдзя Гродзеншчыны стварыла майстар-метадыст аддзела рамеснай дзейнасці Карэліцкага дома рамёстваў Вольга КРЫШЭНЬ. Палатно памерам 90 на 85 сантыметраў набыла жыхарка Гродна, а майстрыха плануе зрабіць падобную карціну крыху меншага памеру.

Фота Вікторыі КАСЦЮК.

Кошт карціны (а гэта 250 долараў у эквіваленце), дарэчы, — гэта фактычна толькі цана матэрыялаў на яе стварэнне. Французскае мулінэ, якім вышыты аўтэнтычныя арнаменты кожнага з 17 раёнаў, абышлося ў 100 долараў, столькі ж пайшло на афармленне рамы і льняное палатно.

Толькі на збор арыгінальных узораў, характэрных для пэўнага рэгіёна, спатрэбіўся месяц. Столькі ж часу заняла сама вышыўка.

— Узоры вышыўкі для мястэчак браліся з розных побытавых прадметаў, — кажа Вольга Крышэнь. — Там, дзе на карціне шчыльная заліўка (заткана ўся плошча), я выкарыстоўвала ўзоры з посцілак. Гэта, напрыклад Зэльвенскі і Свіслацкі раёны. Для Бераставіцкага ці Мастоўскага, дзе пад вышыўкай заставаўся фон, узор брала з ручнікоў. На Карэліцкім раёне красуе вышыўка з карунак абруса, а для Астравеччыны падышла вышыўка з вязанага настольніка.

Карціна ў левым верхнім кутку аздоблена гадзіннікам, колеры якога сімвалізуюць чатыры пары года. А па перыметры палатно таксама вышыта сімвалічна: зверху — аўтэнтычны ўзор Віцебскай вобласці, з якой мяжуе Гродзеншчына, знізу — Брэсцкай, з правага боку — Мінскай, а з левага — Беластоцкага ваяводства.

Ірына СІДАРОК.

Выстаўка

Шкарпэткі для пустыні, кінжалы-каштоўнасці і тканіны адцення куркумы

Звыш 100 прадметаў рамеснай спадчыны Амана прадстаўленыя ў Мінску

Плецены з пальмавага лісця посуд для малака, традыцыйныя прыборы для гатавання і падачы кавы, нацыянальнае адзенне з розных рэгіёнаў, паясы з ножнамі і цырыманіяльная зброя, курыльніцы для ладану і распырсквальнікі ружавай вады, сярэбраныя ўпрыгажэнні як быццам наўпрост з Сярэднявечча і тканыя дываны з вярблюджай воўны, выраблены рамеснікамі толькі сёлета, але з захаваннем старажытнай тэхналогіі... З 19 верасня да 19 студзеня 2020-га адна з выставачных залаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі — нібыта філіял усходняй казкі. Тут адкрылася і чакае наведвальнікаў экспазіцыя «Аман: жамчужына Усходу. Рамесная спадчына» з калекцыі Нацыянальнага музея Султаната Аман.

Сябраваць культурамі нашы краіны пачалі не так даўно — толькі летась быў падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні ў сферы спадчыны і культуры, а таксама пагадненне аб супрацоўніцтве паміж музеямі. Гісторыя і культура Беларусі былі прэзентаваныя ў Аманскім нацыянальным музеі ў Маскаце падчас адмысловай выстаўкі «Беларусь — на скрыжаванні цывілізацый», якая, дарэчы, стала першай замежнай выстаўкай з моманту яго адкрыцця ў 2016 годзе. Крок у адказ — экспазіцыя «Аман: жамчужына Усходу», што знаёміць беларусаў з узорамі матэрыяльнай і духоўнай культуры, традыцый Султаната Аман.

Генеральны дырэктар Нацыянальнага музея Султаната Аман Джамал аль-Мусаві раіць пачынаць агляд з кінжалаў Ханджар. Бо гэта больш чым зброя — нацыянальны сімвал, які прысутнічае нават на дзяржаўным гербе краіны. Вытворчасць кінжалаў Ханджар спалучае ў сабе работу са сталлю, дрэвам, тканінай, скурай, рогам і серабром; дзяржальна, лязо, ножны і паясы вырабляюцца паасобку і толькі потым збіраюцца ў адзіны ансамбль.

Нашы культуры бліжэйшыя, чым здаецца з першага погляду. Гэта разумееш, разглядаючы «пустынныя шкарпэткі» з казінай воўны, якія абараняюць ногі ад гарачага альбо невыносна халоднага пяску, скарпіёнаў, змей і шыпоў — і няўлоўна нагадваюць валёнкі. А вось прасторная аранжавая кашуля дзішдаша з Усходняга Аману, наадварот, пахне экзотыкай — у літаральным сэнсе. Бо фарбуюць нябеленую баваўну, скарыстоўваючы сумесь з куркумы, алею, гваздзікі, струкоў кардамону: пігмент дае аранжавы колер, а алей і спецыі абараняюць тканіну ад пылу і поту і надаюць устойлівы, рэзкаваты водар. Хусткі канга з уплеценымі залатымі і сярэбранымі ніткамі ўпрыгожаныя не толькі друкаванымі малюнкамі, але і надпісамі на суахілі, арабскай ці англійскай мове, праз якія можна даведацца пра рэлігійныя, сацыяльныя і нават палітычныя погляды яе ўладальніка — таму канга часам называюць «тканінай, якая гаворыць»... Словам, і з першага, і з другога, і з трэцяга погляду тут ёсць што разгадваць, таму куратар выстаўкі, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела рускага і замежнага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі **Кацярына Дасько** заўважае, што некалькі месяцаў экспанавання — зусім невялікі тэрмін: «Аманская культура мае шматвяковую гісторыю, але яна някідкая. Каб зразумець яе і пранікнуцца, варта наведаць выстаўку не адзін раз, уважліва ўглядацца ў дэталі ўпрыгажэнняў і адзення, шораз заўважаючы нешта новае».

Выстаўка ўмоўна падзеленая на некалькі блокаў, якія наглядна паказваюць месца вярблюдаў у жыцці аманцаў, гасціннасць і падачу ежы, ткацкае рамяство, ювелірныя вырабы і цырыманіяльную зброю, веравызнанне і культуру духмянасцяў. «У экспазіцыі прадстаўленыя больш за 100 прадметаў, — расказвае Джамал аль-Мусаві, — яе канцэпцыю мы распрацоўвалі разам з беларускімі калегамі, каб паказаць у Мінску культурную спадчыну, якая і сёння з'яўляецца часткай нашага ладу жыцця: гэта ўнікальныя аманскія кінжалы, у тым ліку два султанскія, прадметы, звязаныя з культурай водараў, упрыгажэнні, якімі славіцца Аман, прадметы мужчынскага, жаночага і дзіцячага адзення — яно яркае і вельмі разнастайнае, бо кожны раён мае свае традыцыі...»

Канешне, агульная калекцыя, якая захоўваецца за некалькі тысяч кіламетраў ад Мінска ў сталіцы Амана Маскаце, у шмат разоў багацейшая. У Нацыянальным музеі Султаната Аман на плошчы 24 тысячы квадратных метраў прадстаўленыя больш за 7 тысяч прадметаў, якія адлюстроўваюць у тым ліку нематэрыяльную спадчыну краіны: паэзію, казкі, гастраномію, традыцыйныя танцы і г. д. Музей, як не без гонару адзначае яго кіраўнік, абсталяваны найсучаснейшымі тэхналогіямі, мае асобны асветніцкі цэнтр, дзе вядзецца работа са школьнікамі і студэнтамі, а таксама ўласныя рэстаўрацыйныя лабараторыі і кіназалу для дэманстрацыі дакументальных фільмаў пра культурную спадчыну Амана. Акрамя таго, інфраструктура музея адпавядае патрабаванням інклюзіі — ён дасяжны для невідушчых і наведвальнікаў у інвалідных каляскаx.

На адкрыцці выстаўкі «Аман: жамчужына Усходу» **міністр культуры Беларусі Юрый Бондар** падкрэсліў, што гэты праект стане яшчэ адным важным этапам у супрацоўніцтве нашых краін. І насамрэч, экспазіцыя — толькі частка маштабнай праграмы, у якой прысутнічаюць падпісанне мемарандуму аб узаемаразуменні паміж архіўнымі ведамствамі нашых краін, перадача больш чым 500 кніг у падарунак Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, правядзенне культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў для дзяцей і моладзі. У студзені наступнага года Нацыянальны музей Султаната Аман стане ганаровым госцем на святкаванні 80-годдзя нашага Нацыянальнага мастацкага музея, а крыху пазней у тым жа годзе запланавана правядзенне Дзён культуры Беларусі ў Амане.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Больш здымкаў глядзіце на нашым сайце www.zviazda.by.

На слыху

КОЛЕР НАСТРОЮ — ПОПЕЛЬНЫ

Пераможцай нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне» стала 14-гадовая мінчанка

Увечары 20 верасня адбыўся фінал нацыянальнага адбору дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2019», што пройдзе сёлета ў польскім Глівіцы. Гледачы і прафесійнае журы выбіралі чарговага музычнага дэлегата з 10 удзельніц — так атрымалася, што сіта папярэдняга тура прайшлі толькі дзяўчаты-спявачкі і дзявочыя калектывы.

Сёлета, дарэчы, арганізатары пастараліся выключыць накруткі ў глядацкім галасаванні, таму з кожнага тэлефоннага нумара прымаліся толькі адзін званок і СМС-паведамленне. Паралельна свае адзнакі юным артысткам выстаўляла прафесійнае журы, куды ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры, Белтэлерадыёкампаніі, педагогі, кампазітары і выканаўцы.

Як часта бывае на «Еўрабачанні», фаварыты ў публікі і суддзяў аказаліся розныя. Так, у гледачоў найвялікшыя сімпатыі выклікала Марыя Ермакова з беларускамоўнай версіяй песні VETRA (1907 галасоў —12 балаў), а журы паставіла свае 12 балаў гурту Monkey Tops. Атрымалася парадаксальная рэч: тыя юныя артысты, якія ўжо маюць у творчым багажу значныя дасягненні, засталіся па-за межамі топ-3 найлепшых: ні сёлетняя пераможца дзіцячага конкурсу «Славянскі базар у Віцебску» Ксенія Галецкая, ні ўдзельніца шостага сезона расійскага шоу «Голас. Дзеці» магіляўчанка Арына Пехцерава, ні леташняя пераможца дзіцячага фэсту Сан-Рэма, чатырохразовая фіналістка нацыянальнага адбору Марыя Жыліна ў лідары не трапілі. Затое Елізавета Міснікава, што выступала пад нумарам 1, які рэдка прыносіць удачу, атрымала ад гледачоў і журы па 10 балаў, абышла ўсіх канкурэнтак — і заваявала права прадставіць нашу краіну на дзіцячым «Еўрабачанні-2019».

— Гэта было маёй марай! — эмацыянальна прызналася артыстка адразу пасля завяршэння гала-канцэрта. — Я тройчы ўдзельнічала ў нацыянальным адборы і не трапляла ў фінальную дзясятку, а сёння я ў дзясятцы і я нумар адзін! Прыз-сэрца пастаўлю ў студыі, каб усе яго бачылі, цяпер галоўнае — данесці яго цэлым са сцэны, гэта яшчэ нікому не ўдавалася, але я данясу! Хто мае самыя галоўныя балельшчыкі? Бацькі і вялікая каманда #teamПепельны, якім я вельмі ўдзячная за падтрымку. Цяпер трэба дагнаць аднакласнікаў у школе, бо я там даўно не была, і прыкласці ўсе намаганні для падрыхтоўкі да «Еўрабачання». Сёння я выклалася на 100 %, але ў Польшчы абяцаю выступіць яшчэ ў тысячу разоў лепей і пастараюся прынесці Беларусі перамогу.

Лізе Міснікавай 14 гадоў, яна вучаніца музычнай школы і сталічнай гімназіі № 56, а таксама падапечная Вольгі Драздовай, у вакальнай студыі StudioPlay якой займаліся і папярэднія ўдзельнікі дзіцячага «Еўрабачання» — Даніэль

Яструмскі, Руслан Асланаў, Хелена Мерааі. Песня «Пепельный» беларускіх аўтараў Наталлі Тамбоўцавай і Кірыла Гуда, з якой дзяўчына выступіць у Польшчы, — пра тое, як лёгка ў сучасным свеце чалавек можа змяняцца (даслоўна: «Переназови — и серый станет silver», «Ты сегодня в серой майке, а завтра — пепельный, пепельный, яркий и пепельный»). Зрэшты, артыстка не выключае, што аранжыроўка і тэкст песні да міжнароднага конкурсу яшчэ будуць удасканальвацца, балазе да 24 лістапада час ёсць.

Нагадаем, для Беларусі гэта будзе ўжо 17-е выступленне на дзіцячым «Еўрабачанні». На гэты момант у «медальным заліку» конкурсу лідзіруе Грузія, у якой тры перамогі, па дзве — у Беларусі, Расіі і Мальты, таксама прадстаўнікі нашай краіны адзін раз займалі другое месца і двойчы — трэцяе.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении электронных торгов	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by
Продавец	СУП «Гомельская СПМК-49» ОАО «Гомельоблстрой» г. Гомель, ул. Борисенко, д. 8
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов

Имущество, реализуемое одним лотом в составе

Наименование	Инвентарный номер	Общая площадь, кв. м
Здание административно-хозяйственное	350/С-162112	2 295,6
Здание главного производственного корпуса	350/С-75242	5 769,1
Малярное отделение с закрытой стоянкой на 3 машино-места	350/С-63415	621,3
Здание очистных сооружений	350/С-75235	35,4
Здание очистных сооружений	350/С-75233	333,4
Здание автозаправочного пункта	350/С-75239	9,6
Инженерные сети – водопровода и канализации	24700730	–
Недвижимые улучшения – ограждение железобетонное	24700735	–
Недвижимые улучшения – ворота с редуктором	200117	–
Недвижимые улучшения – ворота	200118	–
Недвижимые улучшения – благоустройство территории (покрытие)	24700734	–
Емкость для хранения ГСМ	200141	–
Емкость для хранения ГСМ	200144	–
Емкость для хранения ГСМ	200145	–
Емкость для хранения ГСМ	200152	–
Емкость для хранения ГСМ	200154	–
Ворота въездные	б/н	–

Составные части, входящие в состав лота: Кран подвесной (инв. № 2252); Кран подвесной (инв. № 2253); Кран подвесной (инв. № 2244); Кран подвесной (инв. № 2584); Кран подвесной (инв. № 2251); Кран подвесной, г/п ТЭЗ 621 (инв. № 2366); Кран подвесной, г/п ТЭЗ 621 (инв. № 2367); Кран подвесной, г/п ТЭЗ 621 (инв. № 2368); Кран подвесной, г/п ТЭЗ 621 (инв. № 2370); Кран-балка Т-320 (инв. № 2605); Маслораздаточная колонка ОК-1 (инв. № 9280); Маслораздаточная колонка ОК-1 (инв. № 298); Маслораздаточная колонка ОК-1 (инв. № 6); Емкость для хранения ГСМ (инв. № 200206); Емкость для хранения ГСМ (инв. № 200207); Емкость для хранения ГСМ (инв. № 200208)

Сведения о земельном участке: земельный участок площадью **3,6354 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания производственной базы

Местонахождение предмета электронных торгов: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, д. 8

Начальная цена лота без НДС 2 994 380,00 бел. руб.

Шаг электронных торгов 149 719,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15 (пятнадцать)** рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным на сайте www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 5 (пяти) после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

ЛОТ № 1	Капитальное строение с инв. № 500/С-38607, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/2. Площадь – 1606 кв. м. Наименование – Производственно-складской корпус № 1. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а), площадка (Литер б, в, г), подпорная стенка (Литер д), бордюр 0,16 (Литер е), ограждение (Литер ж, и). Обременение: аренда. Внутриплощадочный ж/дор. путь (Колядичи). Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005933, площадью 0,6288 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования, срок действия: не установлен. На земельном участке установлены следующие ограничения: Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0136 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0100 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,1300 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,2070 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0310 га
Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN	**1 217 146,34**
Задаток, BYN	**121 714,63**
Шаг аукциона	5 %
ЛОТ № 2	Капитальное строение с инв. № 500/С-38608, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60. Площадь – 6672 кв. м. Наименование – здание специализированное складов. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а), дорожка (Литер б, в), площадка (Литер г, д, е, ж, и, к), бордюр 0,08 (Литер л), бордюр 0,16 (Литер м), ограждение (Литер н, п), ворота (Литер р). Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем. Капитальное строение с инв. № 500/С-38611, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/1. Площадь – 11,5 кв. м. Наименование – Контрольно-пропускной пункт. Назначение – Здание неустановленного назначения. Гараж кирпичный (Колядичи); Внутриплощадочный ж/дор. путь (Колядичи); Электроподстанция 2КТП-400/1; Лифт грузовой грузоподъемностью 3,2 тонны; Лифт грузовой грузоподъемностью 3,2 тонны; Передаточные устройства (Колядичи); Передаточные устройства (Колядичи); Грязеотстойники и бензомаслоупак. (Колядичи). Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005934 площадью 1,0714 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Срок действия: не установлен. На земельном участке установлены следующие ограничения: Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0272 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0506 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,1640 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,2864 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0400 га
Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN	**4 689 783,24**
Задаток, BYN	**468 978,32**
Шаг аукциона	5 %
ЛОТ №3	Капитальное строение с инв. № 500/С-38609, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/3. Площадь – 1063 кв. м. Наименование – Склад ядохимикатов. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а, б), площадка (Литер в, г, д, е, ж), бордюр 0,16 (Литер и), ограждение (Литер к, л), ворота (Литер м, н). Обременение: аренда. Капитальное строение с инв. № 500/С-38610, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/4. Площадь – 1292,5 кв. м. Наименование – Здание склада. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда. Капитальное строение с инв. № 500/С-38612, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/5. Площадь – 8 кв. м. Наименование – Контрольно-пропускной пункт. Назначение – Здание неустановленного назначения. Обременение: аренда. Навес металлический (Колядичи); Металлический склад (Колядичи); Внутриплощадочный ж/дор. путь (Колядичи); Кран-балка (грузоподъемностью 1 т. Бабушкина-60); Кран-балка (грузоподъемностью 2 т. Бабушкина-60). Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005935 площадью 2,3197 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Срок действия: не установлен. На земельном участке установлены следующие ограничения: Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0326 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,6892 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,3700 га
Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN	**1 431 564,71**
Задаток, BYN	**143 156,47**
Шаг аукциона	5 %
Сведения об организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны	ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Куйбышева, 35, пом. 1. тел.: 8 017 284 94 32, факс: 8 017 286 76 80.
Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны	ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Куйбышева, 35, пом. 1. тел.: 8 017 284 94 32, факс: 8 017 286 76 80.
Сведения о представителях Продавца для осмотра/ознакомления с предметом аукциона	Ведущий специалист по маркетингу ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» Попова Екатерина Владимировна, +375 17 284 94 32
Срок подписания договора купли-продажи	Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона	Победитель повторного аукциона или единственный участник повторного аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах повторного аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона
Условия оплаты	Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях на следующие банковские реквизиты: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240 ОКПО 37392696. Оплата задатка производится нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты на следующие банковские реквизиты: В белорусских рублях: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240 ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона
Место, дата и время приема заявлений на участие в повторном аукционе	Заявления на участие в повторном аукционе и необходимые документы принимаются **до 30 сентября 2019 (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35
Место, дата и время проведения повторного аукциона	Повторный аукцион состоится **4 октября 2019 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»

Организатор повторного аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения повторного аукциона, указанной в извещении о проведении повторного аукциона, отказаться от его проведения

Порядок проведения повторного аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»

Дополнительная информация по тел. +375 17 284 94 32. E-mail: arenda@horizont.bn.by

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703		
Продавец	ОАО «Молодечненский станкостроительный завод», г. Молодечно, ул. Замковая, 19		
Предмет аукциона **Местоположение:** Минская обл., Молодечненский р-н, **г. Молодечно**, ул. Замковая, 19			
Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес (№ дома)
Лот № 1			
Здание блока вспомогательных цехов	2676,8 кв. м	630/С-79012	19/М
Составные части и принадлежности: навес на металлических столбах			
Начальная цена с НДС 20 % – 34 508,76 бел. руб. (снижена на 90 %)			
Лот № 2			
Административно-хозяйственное помещение	1313,8 кв. м	630/D-45418	19А/3-1
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 95 986,08 бел. руб.ц (снижена на 80 %)			

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи — **10** рабочих дней после проведения аукционацц

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 08.10.2019 в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 07.10.2019 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280-36-37; +375 44-317-95-42. www.cpo.by.
E-mail: auction@cpo.by

Извещение о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома

Дата, время и место проведения аукциона	**28 октября 2019 г.** в 11.00 г. п. Свирь, ул. А. Гуриновича, д. 29-1, каб. 7. Свирский сельский исполнительный комитет
Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов	г. п. Свирь, ул. А. Гуриновича, д. 29-1, каб. 6, Свирский сельский исполнительный комитет, тел. (8-01797) 42-6-35, тел./факс (8-01797) 42-2-51 С момента опубликования извещения до 16.00 24 октября 2019 г. В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00
Порядок осмотра земельных участков на местности	В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00
Условия проведения аукциона	Наличие не менее двух участников
Продавец	Свирский сельский исполнительный комитет
Организатор аукциона	Свирский сельский исполнительный комитет: **г. п. Свирь, ул. А. Гуриновича, д. 29-1, тел. (8-01797) 42-6-35, тел./факс (8-01797) 42-2-51**
Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе	Размер задатка: 10 % от начальной цены. Документы: заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации. Реквизиты: р/с BY44AKBB36006231119030000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, Получатель платежа: главное управление МФ РБ по Минской области,УНН 600537220, код платежа 04901
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона	В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка); произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта; соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне
ЛОТ № 1	
Адрес объекта и его наименование	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Грумбиненты площадью 0,25 га (кадастровый номер 624077405101000055). **Начальная цена 5 000 (пять тысяч) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены
Ограничения в использовании земельного участка	Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне «Голубых озер» на площади 0,25 га
Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Имеется возможность подключения к электроснабжению.
Информация о затратах на организацию и проведение аукциона	Всего 467,54 руб., в том числе: формирование земельного участка – 190,34 руб. регистрация земельного участка – 30,00 руб. стоимость извещения о проведении аукциона – 247,20 руб.
Дополнительно	О возмещении затрат в соответствии с постановлением Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в т. ч. проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» – возмещение не требуется

Экалогія

КЛІМАТЫЧНЫ АПАКАЛІПСІС

КАЛІ НАДЫДЗЕ

Сёння практычна кожны чалавек на планеце ведае пра экалагічныя праблемы, якіх з кожным годам робіцца ўсё больш. Аднак далёка не ўсе разумеюць, якую пагрозу на самай справе ўяўляе сабой змяненне клімату. Магчыма, хто-небудзь з вас памятае навіну пра тое, што чалавецтву засталося 12 гадоў для таго, каб прадухіліць кліматычны апакаліпсіс. На думку некаторых іншых спецыялістаў, у нас з вамі наогул няма і 18 месяцаў. Так гэта на самай справе ці не, але дакладна вядома адно: змяненне клімату — праблема больш сур'ёзная, чым лічылі раней, мяркуюць аўтары партала hi-news.ru.

Тэрміны перасунуліся

Зусім нядаўна ў сусветна вядомым выданні The New Yorker выйшаў артыкул Джонатана Франзена. Пісьменнік і журналіст лічыць, што нам з вамі пара перастаць валяць дурня і прызнаць непазбежнае — мы не зможам спыніць змяненне клімату. На думку Франзена, усім нам варта сканцэнтравацца на тым, што добрага можа зрабіць кожны з нас ужо сёння, таму што вялікая светлая будучыня чалавецтва ў цэлым можа так і не надысці.

Ці варта казаць, што артыкул Франзена ўскалыхнуў грамадскасць. Вядомы кліматолаг Кейт Марвел напісала артыкул у адказ у не менш паважаным выданні Scientific American, у якім прывяла аргументы на карысць таго, што час яшчэ ёсць і не ўсё страчана. На думку Марвел, апускаць рукі мы з вамі проста не маем права. Але хто ж з іх у большай ступені мае рацыю і чаму не толькі Джонатан Франзен лічыць, што мы асуджаныя?

Каб гэта зразумець, прывядзём лічбы са справаздачы, прадстаўленай міжурадавай групай экспертаў па змяненні клімату пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Паводле гэтай справаздачы, для падтрымання росту глабальнай тэмпературы ніжэйшым за 1,5 градуса Цэльсія ў бягучым стагоддзі выкіды вуглякіслага газу на планеце павінны быць скарочаныя на 45 % ужо да 2030 года. А гэта ўсяго праз 11 гадоў.

Аднак у 2017 годзе адзін з вядучых кліматолагаў свету Ханс Ёахім Шэльнхубер, заснавальнік і цяпер ганаровы дырэктар Патсдамскага інстытута клімату, заявіў пра тое, што апошнім тэрмінам з'яўляецца не 2030-ы. Мы павінны істотна скараціць колькасць шкодных выкідаў у атмасферу ўжо ў 2020 годзе, лічыць ён. А ён не тое што не за гарамі, а практычна надыходзіць! На думку вучонага, мы здольныя нанесці планеце смяротны ўдар ужо праз 18 месяцаў. Акрыяць ад наступстваў будзе немагчыма.

Менш за год на сур'ёзныя меры

Да канца 2020 года ўрадавыя групы ААН павінны сабрацца, каб абмеркаваць прыняцце экстранных мер па барацьбе са зменай клімату. Нагадаем, што ў 2015 годзе шматлікія сусветныя лідары падпісалі Парыжскае пагадненне, згодна з якім усе краіны-ўдзельніцы павінны істотна скараціць выкід вуглякіслага газу ў атмасферу.

Сёння эксперты прызнаюць, што рашучыя палітычныя крокі, якія дазволяць скараціць выкіды, павінны быць зроблены да канца наступнага года. Першым сур'ёзным рухам павінен стаць спецыяльны кліматычны саміт, скліканы Генеральным сакратаром ААН Антоніа Гуцерышам, які праходзіў у Нью-Ёрку 21—23 верасня. Раней генсек ясна даў зразумець, што на саміце павінны прысутнічаць прадстаўнікі толькі тых краін, якія здольныя ўнесці істотныя прапановы па паляпшэнні сваіх планаў скарачэння выкідаў вугляроду. Затым адбудзецца саміт у Сант'яга, Чылі.

Падобныя захады, якія робяцца сусветнымі лідарамі, даюць усім нам надзею на светлую будучыню. Бо ад гэтых рашэнняў залежыць не толькі наша з вамі будучыня, але і жыццё, ды што там — існаванне ўсіх будучых пакаленняў. Немалаважнай з'яўляецца думка грамадскасці на гэты конт — не так даўно па Еўропе пракацілася серыя мітынгаў, якія зладзілі падлеткі, імверна, натхнёныя кліматычным актывізмам юнай Грэты Тунберг (шведская дзяўчынка прапускала школу па пятніцах са жніўня 2018 года, каб ладзіць адзіночныя пікеты супраць глабальнага пацяплення каля парламента сваёй краіны). А напярэдадні саміта акцыі ахапілі і Нью-Ёрк, так што паліцыі давялося перакрываць раён ніжняга Манхэтэна. На такія маршы выходзяць пераважна маладыя людзі, якія разумеюць, што ў будучыні на знявечанай Зямлі жыць менавіта ім. У рэшце рэшт некаторыя краіны, напрыклад Вялікабрытанія, ужо прынялі шэраг заканадаўчых мер, накіраваных на зніжэнне выкідаў у атмасферу.

Спыніць вымiранне

Аднак, нягледзячы на пазітыўныя змены, прычын хвалявацца ў нас з вамі ўсё ж дастаткова. На думку шматлікіх вучоных, намеры ЗША

Грэта Тунберг на акцыі пратэсту.

выйсці з Парыжскага пагаднення, бяздзейнасць лідараў Кітая, Расіі і Бразіліі ставяць будучыню ўсёй планеты пад пагрозу. Сёння мы дасягнулі пункта, калі любы крок кожнай асобнай дзяржавы можа стаць вырашальным. Відавочна, не ўсе сусветныя лідары гэта разумеюць.

Нам з вамі застаецца спадзявацца на тое, што падчас саміту ААН 26 верасня генеральнага сакратара ААН атрымаецца пераканаць лідараў, якія сумняваюцца, у тым, каб адсунуць свае фінансавыя і геапалітычныя інтарэсы на задні план. Калі мы не зробім істотных дзеянняў у найбліжэйшыя 18 месяцаў, многія спецыялісты прадракаюць нашай планеце вельмі змрочную перспектыву.

Раней сёлета сур'ёзнае хваляванне сярод кіраўнікоў дзяржаў выклікала даследаванне IPBES*, прысвечанае масаваму вымiранню відаў у іх натуральным асяроддзі пражывання. Прычынай гібелі жывёл з'яўляюцца дзеянні чалавека. Справаздача паказала, што ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі можа быць страчана да мільёна відаў жывёл.

Зямля будзе знішчана?

Складана сказаць. Думкі спецыялістаў разыходзяцца. Шматлікія вучоныя і грамадскія дзеячы лічаць, што ніхто з нас не павінен апускаць рукі і са свайго боку мусіць рабіць усё, што ў яго сілах, у барацьбе са змяненнем клімату — спажываць менш чырвонага мяса, не расходаваць дарэмна ваду і іншыя рэсурсы, здзяйсняць менш пакупак. Менавіта наша вар'яцкае спажыванне з'яўляецца прычынай работы велізарнай колькасці заводаў, якія здзяйсняюць такую вялікую колькасць выкідаў шкодных рэчываў у атмасферу.

Вельмі шмат людзей у цяперашні момант згодны з меркаваннем журналіста The New Yorker — хутчэй за ўсё, мы не паспеем і не зможам прадухіліць змяненне клімату.

* *Intergovernmental Science-Policy Platform on Biodiversity and Ecosystem Services (IPBES) — Міжурадавая навукова-палітычная платформа па біяразнастайнасці і экасістэмных паслугах, у склад якой уваходзяць 127 урадаў краін-членаў — глабальны орган, які займаецца ацэнкай стану біяразнастайнасці і ўнёску прыроды ў жыццё людзей у адказ на запыты ад асоб, адказных за прыняцце рашэнняў.*

Космас

Якога колеру неба на іншых планетах?

Венера ўяўляе сабой далёка не той трапічны рай, якім бачылі гэтую планету савецкія пісьменнікі-фантасты.

Як вядома, прамяні нашага Сонца маюць белы колер, які праламляецца аб вялікую колькасць драбнюткіх кропелек вады ў атмасферы і ўтварае велізарную палітру розных колераў і фарбаў. Дзякуючы такой прыроднай з'яве раніцай неба можа мець жамчужнае адценне, днём яно афарбоўваецца ў блакітны колер, а вечарам таго ж дня мы можам любавацца неверагодным закатам, які ўключае ў сябе практычна ўсю каляровую палітру. Разам з тым цікава, як жа праходзіць аналагічны працэс на іншых планетах Сонечнай сістэмы? Ці могуць быць іншапланетныя закаты настолькі ж маляўнічыя, як і на Зямлі?

Марс

Марс — адна з самых вывучаных чалавекам і пры гэтым адна з самых загадкавых планет Сонечнай сістэмы. З-за таго, што марсіянская атмасфера вельмі слабая, а ўтрыманне вады ў ёй мінімальнае, лічыцца, што днём марсіянскае неба мае жаўтлява-карычневы колер. Калі на нашай планеце сонечнае святло рассейваецца дзякуючы драбнюткім кроплям вады, то на Марсе ролю падобных адбівальнікаў адыгрывае пыл чырванаватага адцення, якая надае марсіянскім світанкам і заходам ружаваты колер.



Магчыма, менавіта так выглядае з Іа Юпітэр.

Венера

Венера — сястра-блізня Зямлі, толькі ў шмат разоў больш злая і гарачая. Яе паверхню акружае настолькі тоўстая атмасфера, што Сонца з паверхні Венеры ўяўляе сабой проста размытую пляму, якую схавалі за шчыльным хмарным покрывам. З-за вялікага ўтрымання сернай кіслаты ў аблоках Венеры сонечнае святло, рассейваючыся скрозь іх, надае венерыянскаму небу жоўта-аранжавы колер з зеленаватым адлівам.

Меркурый

З-за таго, што Меркурый не мае якой-небудзь атмасферы, дзённае і начное неба на планеце практычна не адрозніваецца ад выгляду з космасу. Дакладна такая ж сітуацыя ўзнікла і на Месяцы, які, дарэчы, падобны на Меркурый па многіх параметрах. Аднак маленькая жалезная планета, размешчаная блізка да Сонца, можа пахваліцца іншай выдатнай якасцю: з яе паверхні Сонца здаецца ў 2,5 раза большым, чым пры поглядзе з Зямлі. У такога жывапіснага нюансу ёсць толькі адзін недахоп — блізкае размяшчэнне планеты да сваёй зоркі практычна заўсёды ідзе рука аб руку з велізарным узроўнем радыяцыі і тэмпературай, здольнымі імгненна знішчыць усё жывое, што можа апынуцца на паверхні падобнага непрыязнага свету.

Планеты-гіганты

Не існуе якіх-небудзь дакладных малюнкаў, якія перадалі б каляровую палітру неба планет-гігантаў Сонечнай сістэмы. Разам з тым лічыцца, што неба Юпітэра афарбавана ў цёмна-блакітны колер, а яго аблокі маюць адценні ўсіх колераў вясёлкі. Акрамя таго, на фоне такога маляўнічага неба, з паверхні Юпітэра (уявім, што яна ў яго ёсць) можна ўбачыць усе чатыры галілеевыя спадарожнікі. Самым яркім аб'ектам са спадарожнікаў у небе планеты-гіганта з'яўляецца Іа, якая з прычыны сваёй блізкасці да Юпітэра выглядае нават больш, чым поўны Месяц у начным небе Зямлі.

Асаблівую маляўнічасць небу Сатурна надаюць раскошныя кольцы планеты.

Неба Сатурна афарбавана ў ярка-жоўтыя адценні, якія перарываюцца велізарнай паласой праз усё неба планеты. Як вы думаеце, чым можа быць гэтая загадкавая паласа? Правільна! Кольцы Сатурна прыўносяць своеасаблівую маляўнічасць у заходы і світанкі на другой па памерах у Сонечнай сістэме планеце.

Неба Урана і Нептуна можа пахваліцца яркім блакітным колерам. Кольцы гэтых планет будуць абсалютна непрыкметныя назіральніку, які нейкім невядомым чынам з'явіўся б там праз атмасферы гэтых планет. Адзінымі яркімі аб'ектамі ў небе гэтых Урана і Нептуна могуць быць іх спадарожнікі, якія часам прабягаюць па небасхіле.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Зберагчы і працягнуць

12 ІМГНЕННЯЎ СПАДЧЫНЫ

Адкрыццё выстаўкі рэдка пачынаецца са спеваў і казак. Але ў нашым выпадку гэта было не толькі апраўданым рэжысёрскім ходам, але і неабходнасцю, бо і спевы, і казкі — неад'емная частка экспазіцыі «Нематэрыяльная культурная спадчына Міншчыны», што працуе ў Мінскім абласным цэнтры народнай творчасці. Упершыню тут сабралі і паказалі дванаццаць элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны з розных куткоў Мінскай вобласці, унесеныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў (а два з іх — калядны абрад «Цары» з вёскі Семежава на Капыльшчыне і «Будслаўскі фэст» з Мядзельскага раёна — уключаныя ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА).

«Нематэрыяльная спадчына як культурная з'ява яшчэ не да канца ацэненая грамадствам, дый нават самімі носьбітамі, — мяркуе **вядучы метадыст аддзела традыцыйнай культуры МАЦНТ Ігар ЖАЛТКОЎ.** — Між тым менавіта яна з'яўляецца краевугольным каменем ідэнтычнасці беларусаў. Вобраз Беларусі ў свядомасці яе жыхароў складаецца, як пазл, з элементаў нематэрыяльнай спадчыны, і гэты вобраз злучае нас у адзіны народ. Таму цяперашняя выстаўка — вельмі значная, і, на мой погляд, у пэўным сэнсе ўнікальная падзея, якая прадстаўляе шырокую палітру ідэнтыфікатараў нацыянальнай культуры».



«Зараз рыхтуюцца дакументы па ўнясенні ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў яшчэ двух аб'ектаў — гэта абрад выпякання хлеба ў вёсцы Жораўка Любанскага раёна і традыцыя саламяных дываноў «Рухаўскія дываны» Старадарожскага раёна», — дадае **кіраўнік Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці Ірына ПАЗНЯК.**

«Само паняцце «нематэрыяльная культурная спадчына» з'явілася адносна нядаўна — у 2003 годзе, пасля прыняцця адпаведнай канвенцыі ЮНЕСКА, якую наша краіна падпісала адной з першых у свеце, — нагадвае **дырэктар фонду «Культурная спадчына і сучаснасць», эксперт Беларусі ў міжурадавым камітэце па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА Ала СТАШКЕВІЧ.** — З 2014 года мы актыўна пачалі працэс ідэнтыфікацыі, інвентарызацыі гэтай спадчыны — быў створаны беларускі нацыянальны інвентар «Жывая спадчына». І я вельмі рада, што за пяць гадоў, якія мінулі з пачатку гэтай работы, у спісе гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ўжо 126 элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Асабліва ўсцешвае тое, што працэс ідзе знізу ўверх, ад саміх носьбітаў гэтых традыцый, рамёстваў, абрадаў і практык, якія зацікаўлены, каб дзяржава ўзяла пад ахову элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, забяспечыла іх жыццядзейнасць. Бо гэтыя рэчы нельга закансерваваць, яны — плыні ў вялікай рацэ жывой культуры, што мусіць развівацца і перадавацца з пакалення ў пакаленне».

Як элементы нематэрыяльнай спадчыны прадстаўленыя на выстаўцы? Вельмі нават рэчыўна і адчувальна. У адным кутку прасторнай залы стаіць стол, дзе ўсе ахвотныя могуць прысесці і пачытаць казкі Лідзіі Міхайлаўны Цыбульскай — альбо паглядзець на відэазапісах, як іх расказвала сама носьбітка. (Яна, на жаль, некалькі гадоў таму пайшла з жыцця, але казкі засталіся — і ў вусным пераказе пераемніц, і ў друкаваным зборніку «Казкі з прынёманскай хаткі», які ўбачыў свет дзякуючы збіральнікам і папулярызатарам традыцыйнай культуры). Гэтаксама можна адчуць праз відэасюжэты харaство спеўных традыцый з розных раёнаў Міншчыны, памацаць макет дуба, на які цягнуць Каляду, падрабязна вывучыць фоталетапіс розных абрадаў.

У другім куце — персанажы архаічнага каляднага абраду «Шчадрэц»: Каза, Баба і Дзед у адмысловай берасцяной масцы, на кожнага з якіх не толькі варта падзівіцца, але можна і дакрануцца да іх, каб ярчэй уявіць іхнія скокі і спевы. А па суседстве са шчадроўнікамі прыцягвае позірк галоўны герой абрадавага ігрышча «Ката пячы». Да яго не рэкамендуецца падыходзіць галодным, каб не захлынуцца слінкамі, бо кот са Скірмантава смачны: сабраны з булак, кілбас і сала. «Пра гэту жывую традыцыю расказала мне свякроў, — гаворыць **жыхарка аграгарадка Скірмантава Наталля РЭДЗЬКО.** — Ладзяць ігрышча 27 лістапада, да перадкаляднага посту, каб нагуляцца і нажартавацца, як кажуць, на ўвесь год. Хто гуляе? Жанатыя — каб усё ладзілася ў сям'і, нежанатыя, моладзь — каб знайсці сваю пару, а кот выступае ахоўнікам дзеючых і будучых сем'яў. Ката выпякаюць, збіраюць з кавалкаў і падвешваюць высока пад столь, а ўдзельнікі ігрышча бяруць хто відэльцы, хто качаргу і падскокваюць, каб адкусіць кавалак ад ката — і ўсё гэта з танцамі, жартамі, прыгаворкамі...»

Пасярод залы — не заўважыць наўпрост немагчыма — кросны з чырвона-белым ручніком, які прадстаўніца Капыльшчыны, народны майстар Таццяна Волкава выробляе па тых жа тэхналогіях і з тымі ж узорамі, якія некалі скарыстоўвалі нашы пра- і прапрабабулі. А побач прэзентуе свае работы **народны майстар з Валожыншчыны Хрысціна ЛЯМБОВІЧ**, чыя вучаніца тут жа на месцы дэманструе, што такое ткацтва паясоў «на ніце». Хрысціна, дарэчы, з тых рупліўцаў, хто не толькі зберагае рамёствы і традыцыі, але і перадае іх малодшым пакаленням: яна кіруе і гуртком ткацтва, і вучнёўскай батлейкай, выконваючы адначасова педагагічную, асветніцкую і сацыяльную работу. За многія гады ўжо некаторыя яе вучні маюць уласных вучняў. «Не ўсіх дзяцей можна зацікавіць традыцыйнай культурай, — пагаджаецца майстар, — каб зрабіць адзін толькі пояс, трэба шмат цярпення, бо баваўняныя і шарсцяныя ніткі могуць і блытацца, і рвацца, далёка не кожнае дзіця тут справіцца. Але ўжо тыя, хто прыходзіць і затрымліваецца, уцягваюцца ў справу напоўніцу. З майго вопыту, гэтыя дзеці, нават калі яны з неўладкаваных сем'яў, але вельмі адкрытыя, «несучасныя», гатовыя ўспрымаць матэрыі народнай культуры». Зрэшты, майстар-класамі па народных рамёствах усё часцей цікавяцца і дарослыя людзі, гараджане, якія жадаюць звярнуцца да каранёў. І якраз гэта ўсцешвае носьбітаў і захавальнікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, бо калі традыцыі запатрабаваныя ў сучаснікаў — яны жывуць...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Больш фота глядзіце на www.zviazda.by.

Што, дзе, калі

Калядны абрад «Цары» з вёскі Семежава Капыльскага раёна атрымаў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі ў 2008 годзе.

Мясцовы стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых песень аўтэнтычнымі фальклорнымі гуртамі «Журавушка», «Глыбокія крыніцы» і «Павалякі» з вёсак Закальное, Ямінск, Вобчын Любанскага раёна ўнесены ў Дзяржаўны спіс у 2008 годзе.

Калядны абрад «Шчадрэц» з вёскі. Рог Салігорскага раёна — статус нададзены ў 2009 годзе.

Калядны абрад «Цягнуць Каляду на дуба» з вёскі Новіны Бярэзінскага раёна атрымаў статус НКС у 2012 годзе.

Традыцыя ткацтва паясоў у Валожынскім раёне (аграгарадкі Сакаўшчына, Ракаў) — 2016 год.

Выканальніцкае майстэрства ў жанры казачнай прозы Л. М. Цыбульскай з вёскі Магільна Уздзенскага раёна — 2016 год.

Традыцыя шанавання Святога каменя ў вёсцы Крамянец Лагойскага раёна — 2016 год.

Урачыстасць у гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай «Будслаўскі фэст», Мядзельскі раён — 2016 год.

Абрад пераносу Міхайлаўскай свечкі ў аграгарадку Вяляцічы, Барысаўскі раён — 2016 год.

Спеўная традыцыя міжрэчча вярхоўяў Пцічы і Случы, вёскі Баранава і Прусы Старадарожскага раёна — 2016 год.

Тэхніка закладнога ткацтва чырвона-белых ручнікоў з вёскі Семежава Капыльскага раёна — 2012 год.

Ігрышча «Ката пячы» ў аграгарадку Скірмантава Дзяржынскага раёна — 2017 год.

Месцы чароўнай сілы

МОЦ ГАЮЧЫХ КРЫНІЦ

Днямі ў Мінску адбылося ўрачыстае закрыццё сезона працы валанцёраў руху «Добрае Сэрца». З 2013 года ў рамках праекта Саюза моладзі «Аднаўленне святынь. Крыніцы Беларусі» яны добраўпарадкоўвалі тэрыторыі і дапамагалі аднаўляць цэрквы, саборы, касцёлы, іншыя культавыя аб'екты. На сённяшні дзень добраахвотнікі выканалі такія работы прыкладна на 780 аб'ектах па ўсёй краіне, у тым ліку 200 праваслаўных храмаў і манастыроў.

— Праект звязаны з нашымі каранямі, бацькамі, прадзедамі. Ён кажа пра самае галоўнае — пра любоў да роднай зямлі. У гэтым годзе пачатак работы быў пакладзены ў красавіку ў вёсцы Пустынкі Мсціслаўскага раёна. Валанцёры добраўпарадкавалі тэрыторыю Свята-Пустынскага Успенскага мужчынскага манастыра і адной з трох яго гаючых крыніц. Дзейнасць працягвалася і ў іншых знакавых месцах: гэта і крыніца Прасвятой Багародзіцы «Тры ключы» ў вёсцы Красналучка Лепельскага раёна, «Дзедава крыніца» ў Добрушы, крыніца на Замкавай гары ў Навагрудку, крыніца Святога Вялікамучаніка і лекара Панцеляймона ў вёсцы Лоск Валожынскага раёна і іншыя, — адзначыў **першы сакратар ЦК БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК.**

Урачыстае закрыццё сезона работы валанцёраў прайшло ў Храме-помніку ў гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, што выратаванню Айчыны нашай паслужылі. Хлопцы і дзяўчаты перадалі ў дар збаны са святой крынічнай вадой, каб паказаць павагу да роднай зямлі. **Настаяцель Усіхсвяцкага прыхода протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ** звярнуўся да моладзі з важнымі словамі:

— Трэба, каб кожны наш дзень быў напоўнены добрымі справамі. Калі мы будзем берагчы тое, што з'яўляецца працягам жыцця, многае пераўтворыцца ў нашых душах. Асабліва аб гэтым трэба памятаць у моманты ўнутранага спусташэння. Калі пачынаеце адчуваць холад унутры — ідзіце ў храм, памаліцеся за сябе, за бабуль-дзядуляў. Шукайце Бога, каб запоўніць сваё сэрца. І не ігнаруйце сваю душу.

«Сёлета акцэнт быў зроблены менавіта на крыніцы, таму што яны спрадвеку лічыліся чароўнымі, маючымі асаблівую сілу, — расказала **сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, каардынатар валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» Аляксандра ГАНЧАРОВА.** — Тую самую ваду з розных рэгіёнаў краіны і прывезлі хлопцы і дзяўчаты ў падарунак храму».

Асабісты ўдзел кожнага ў праекце адлюстроўвае трапяткое стаўленне моладзі да гісторыі. **Навучэнец Мсціслаўскага дзяржаўнага будаўнічага каледжа Дзмітрый ВАЛОДЧАНКА** разам са сваёй камандай наводзіў парадак на тэрыторыі Свята-Пустынскага Успенскага мужчынскага манастыра ў Мсціслаўскім раёне. «Там мы добраўпарадкавалі крыніцу: зрабілі лавачкі, каб каля крыніцы можна было адпачыць, збудавалі навес. Пасля працы адчуваў стомленасць, але быў задаволены тым, што прынёс карысць роднай зямлі. Праекты, прысвечаныя роднаму краю, любові да зямлі, не пакідаюць абыякавым і зараджаюць на добрыя справы».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Нотны радок

МАНЮШКА Ў СЭРЦАХ, МАНЮШКА Ў ГІСТОРЫІ

Гэты год праходзіць пад знакам вялікага кампазітара Станіслава Манюшкі. Бо менавіта цяпер адзначаецца 200-годдзе з дня яго нараджэння — праходзяць шматлікія канцэрты, навуковыя канферэнцыі, адкрыцці памятных знакаў і многае іншае. Манюшка ў сэрцах, Манюшка ў гісторыі, яго музыка — на сцэнах.
У пасольстве Літвы ў Беларусі адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная гэтаму творцу, а ў мінскім касцёле Найсвяцейшай Тройцы адбыўся сумесны канцэрт беларускіх і літоўскіх музыкаў, на якім выканалі духоўныя творы кампазітара.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літвы ў Беларусі Андрус ПУЛОКАС падзяліўся даволі прыватнымі эмоцыямі, якія звязваюць яго з кампазітарам:

— Апошнім часам ладзіцца нямала ініцыятыў, прысвечаных тым дзеячам культуры, якія нас аб'ядноўваюць. Іх творчасць радуе ўсіх. Я падумаў: «А якія ў мяне адносіны са Станіславам Манюшкам?..» Бо ў кожнага з нас абсалютна рознае стаўленне да славутых людзей. Я зразумеў, што маё дачыненне з кампазітарам адбываецца дзякуючы помнікам. Адразу прыгадваецца наш цудоўны Вільнюс, стары горад. Там, у вельмі ўтульным месцы, стаіць помнік — колькі сябе памятаю, ён быў заўсёды. Даволі стары, зроблены з цёмнага каменю. Аказалася, што гэта самы стары помнік Станіславу Манюшку, усталяваны яшчэ ў 1922 годзе. Пастамент для яго выкарыстаны ад помніка Пушкіна. (Да 1914 года ў Вільнюсе быў помнік гэтаму паэту, але з нейкай прычыны ён быў вывезены ў Расію, затое застаўся пастамент.) Гэты год у Вільнюсе быў аб'яўлены годам Манюшкі — бо значная частка жыцця кампазітара звязана з літоўскай сталіцай. І хоць на той стары помнік зазвычай не надта звяртаюць увагу, не так даўно я быў каля яго і пабачыў некалькі пакладзеных кветак... Значыць, людзі памятаюць, і гэта прыемна.

Прафесар Віктар СКАРАБАГАТАЎ адзначыў, што трэба, каб кожнаму слуннаму ўраджэнцу краіны быў пастаўлены помнік там, дзе ён нарадзіўся ці дзе зрабіў значны ўнёсак у яе культуру, — і тады свядомасць народа абсалютна зменіцца. А тое, што ў беларускай сталіцы нарэшце з'явіўся помнік Манюшку, перакананы прафесар, цалкам змяніла стаўленне ў музычным асяроддзі да кампазітара, яго творчасць пачалі ўспрымаць як уласную спадчыну і шырэй уводзіць у музычны ўжытак.

— У часы Манюшкі за друкаванае беларускае слова маглі пасадзіць у турму назаўтра ж — гісторыя літаратуры, культуры гэта ведае, — дадае Скарабагатаў. — Менавіта ў такіх умовах ставілася першая опера на беларускай мове «Ідылія» («Сялянка»). Натуральна ж, адразу ў дзень абвесткі спектакль забаранілі, афішы сталі здымаць. Аднак прэм'ера ўсё ж такі адбылася, і яшчэ ў пяці гарадах таксама. Уявім сабе Манюшку, які пісаў музыку да беларускамоўнага тэксту Дуніна-Марцінкевіча, — ён што, бессвядома гэта рабіў? Ён рабіў тое абсалютна свядома. Яму Радзіма была важнейшая, чым небяспека трапіць за краты, дзе пабывалі многія іншыя дзеячы.

Кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Вольга САВІЦКАЯ нагадала, што асоба Станіслава Манюшкі ў час святкавання яго 200-годдзя з'яўляецца тым сімвалам, які аб'ядноўвае творчую прастору Беларусі, Літвы і Польшчы. Нарадзіўся будучы кампазітар на Міншчыне, у маёнтку Убель, дзе назапашваўся атмасферай яркага, непаўторнага мясцовага фальклору. Станіслаў вучыўся ў Мінскай мужчынскай гімназіі і музычнай школе Дамініка Стафановіча — у гэты час пазнаёміўся і пасябраваў з многімі маладымі літаратарамі, артыстамі, музыкамі. Пакідаючы Мінск, 17-гадовы Станіслаў Манюшка ўжо цвёрда ўсведамляў сваё кампазітарскае пакліканне.

— У Мінску на гарадской сцэне ў 1834 годзе прагучала музыка Манюшкі да спектакля «Канторскія служачыя», а ў 1843 годзе — да спектакля «Латарэя», — дадае Вольга Савіцкая. — Творчае супрацоўніцтва звязала кампазітара з пачынальнікам новай беларускай літаратуры і беларускага тэатра Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам. На яго словы створаны спектаклі «Рэкруцкі набор», «Спаборніцтва музыкаў», «Чароўная вада». У 1852 годзе ў памяшканні мінскага тэатра з вялікім поспехам прайшла пастаноўка «Ідыліі» («Сялянкі»), дзе ўпершыню загучала беларуская мова.

Да завяршэння «Года Манюшкі» застаецца ўсяго пару месяцаў. Аднак па-сапраўднаму адкрыць для сябе яго творчасць, пачуць і ўбачыць на розных пляцоўках — ад вялікага тэатра оперы і балета да невялічкіх цэркваў і касцёлаў — ніколі не будзе позна.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Рассакрэчанае: пра ўз'яднанне Беларусі

Адну з найважнейшых у нашай гісторыі падзей — уз'яднанне Беларусі 17 верасня 1939 года — Нацыянальная бібліятэка прапануе пазнаць праз архіўныя дакументы, фотаздымкі, перадавыя артыкулы газет, паэзію і графіку. Набыткі з фондаў бібліятэкі, Нацыянальнага архіва Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў аб'ядналіся пад ёмістымі радкамі з верша Янкі Купалы «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі» ў галерэі «Атрыум».

Выстаўка адкрылася ў дзень 80-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. «У партнёрстве з іншымі ўстановамі, што захоўваюць нашу нацыянальную памяць, мы змаглі не толькі паказаць факты і падзеі, што адбываліся на Беларусі ў гэты час, але і перадаць настрой, які панаваў сярод беларускай інтэлігенцыі ў сувязі з узнаўленнем тэрыторыі нашай краіны», — каментуе **першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алена ДАЎГАПОЛАВА.**

«К вам ідзе непабедзімая Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, каб назаўсёды пазбавіць вас ад кабалы паноў, памешчыкаў і капіталістаў, — гаворыцца ў прадстаўленай у экспазіцыі адозве камандуючага Беларускім фронтам Міхаіла Кавалёва, — каб выратаваць вас і вашы сем'і ад пагрозы знішчэння з боку врагоў беларускага народа».

Па экспанатах можна ўбачыць, як Заходняя Беларусь станавілася савецкай — праз вітанне Чырвонай Арміі, стварэнне абласных выканаўчых камітэтаў, нарады старшынь сялянскіх камітэтаў, выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі, мітынгі і так далей. У пастанове Саўнаркама БССР і Цэнтральнага камітэта КП(б)Б пішацца аб адсяленні жыхароў з пагранічнай паласы і ачыстцы яе ад пабудоў, а таксама аб адвядзенні адселеным жыхарам участкаў і надзелаў зямлі.

У тэлеграме Іосіфу Сталіну, дзе паведамляецца аб стане спраў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, між іншым расказваецца, што ў кожным горадзе створаны часовыя ўпраўленні, куды штодня прыходзяць з пытаннямі аб тым, што рабіць з маёмасцю памешчыкаў ці хлебам, забраным палякамі на патрэбы арміі. «Многіх асаднікаў і памешчыкаў сяляне знішчаюць (вешаюць, расстрэльваюць, забіваюць)», — дакладваецца Сталіну.

Не менш паказальнай у кантэксце стаўлення да падзей з'яўляецца частка выстаўкі, што ўключае ў сябе старонкі газет «Звязда» і «Советская Белоруссия». «Працоўныя Заходняй Беларусі аднадушна выказваюцца за ўстанаўленне савецкай улады і далучэнне да Савецкай Беларусі», — паведамляе «Звязда» на першай паласе і піша пра «небывалы энтузіязм», з якім сустракаюць зварот аб скліканні Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, і «адзіную ўладу, што клапоціцца аб інтарэсах народа, — савецкую».

Дапаўняюць выстаўку фотаздымкі, дзе паказваецца, як жыхары сустракаюць воінаў Чырвонай Арміі ці мітынгуюць з расцяжкай «Няхай жыве аб'яднаная Савецкая Беларусь», альбо пісьмовы зварот жыхаркі Мінска да сакратара ЦК КП(б)Б з просьбай накіраваць яе на работу ў Заходнюю Беларусь.

Якім бачыўся верасень 1939-га, выстаўка дакументамі з грыфам «Рассакрэчана», газетнымі палосамі ды вершамі Максіма Танка, Янкі Купалы і Пятруся Броўкі будзе расказваць да 7 лістапада.

Вольга МІЦКЕВІЧ.

Сітуацыя

ЦІ АДНОВЯЦЬ СІНАГОГУ?

У Віцебску на міжнароднай канферэнцыі прадстаўнікі Беларусі і замежныя даследчыкі абмяркоўвалі тэму захавання іўдзейскіх рэлігійных будынкаў. У цэнтры ўвагі былі рэшткі Вялікай Любавіцкай сінагогі, якая знаходзіцца недалёка ад дома-музея Марка Шагала. Будынак уяўляе вялікі інтарэс. Мяркуецца, што туды прыходзіла маліцца сям'я славутага на ўвесь свет мастака.

Цагляная сінагога была пабудавана на месцы драўлянай у 1904-м. У 1980-я гады там быў склад для патрэб вытворчага прадпрыемства. І ўжо доўгі час, на жаль, з-за адсутнасці догляду яна разбураецца...

Канферэнцыю зладзілі Беларускі камітэт ICOMOS — грамадскай арганізацыі, якая вывучае спадчыну, спрыяе яе захаванню, аднаўленню, — і музей Марка Шагала ў Віцебску. Апошні быў задзейнічаны ў праекце па распрацоўцы канцэпцый аднаўлення будынкаў былых сінагог з арыентацыяй на інтарэсы мясцовай супольнасці.

У мерапрыемстве бралі ўдзел гісторыкі, краязнаўцы, музейныя работнікі, вернікі, кіраўнікі іўдзейскіх абшчын з Беларусі, Польшчы, Латвіі, Ізраіля.

Галоўны спецыяліст упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Дзяніс ЮРЧАК адзначыў, што цікавасць грамадскасці да спадчыны павялічваецца, а дзякуючы энтузіястам робяцца рэальныя справы. У прыватнасці, валанцёры добраўпарадкавалі яўрэйскія могілкі ў Бешанковічах — адны з найстарэйшых і найвялікшых у рэспубліцы.

Шмат зроблена ў аграгарадку Лужкі Шаркаўшчынскага раёна, каб захаваць памяць пра стваральніка дзяржаўнай мовы Ізраіля Элізэра Бэн-Ягуду. Дзякуючы прадстаўнікам грамадскасці статус гісторыка-культурнай каштоўнасці надалі былой лужкоўскай сінагозе, пабудаванай у сярэдзіне пазамінулага стагоддзя. Там у хедары (пачатковая рэлігійная школа), які дзейнічаў пры храме, вучыўся будучы славуты сын яўрэйскага народа. Цяпер на яго малую радзіму штогод прыязджаюць сотні людзей з розных краін.

Намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Віктар ГЛУШЫН падкрэсліў, што энтузіясты з часам могуць дабіцца многага: у свой час яны паспрыялі адкрыццю шагалаўскага музея, а летась адчыніўся музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча.

У Вялікай Любавіцкай сінагозе добраахвотнікі правялі суботнік. Віцэ-мэр Віцебска выказаў надзею, што сцены хоць і не будуць выконваць першапачатковыя мэты, затое змогуць выкарыстоўвацца ў якасці «знакавага элемента» пры распрацоўцы турыстычнай інфраструктуры.

Дарэчы, і **галоўны рабін Іўдзейскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі Мардэхай РАЙХІНШТЭЙН** лічыць, што надаваць сінагогам другое жыццё толькі дзеля самога аднаўлення няма сэнсу. Ды і гэта патрабуе вялікіх выдаткаў пры рэстаўрацыі, тым больш — будаўніцтве, як і пры эксплуатацыі будынкаў. Галоўнае — паважаць памяць, расказваць моладзі пра мінулае.

Паводле інфармацыі Яўрэйскага ўніверсітэта ў Ерусаліме, у Беларусі на сёння каля 125 будынкаў — былых сінагог, рэлігійных школ. Прыблізна 60 з іх у разбураным стане.

Дырэктар музея Марка Шагала ў Віцебску Ірына ВОРАНАВА канстатавала, што турыстаў, якія гуляюць у наваколлях установы культуры, цікавяць рэшткі дарэвалюцыйнай забудовы. Між іншым, сінагогу на паперы некалькі гадоў таму ўжо «ўпісалі» ў канцэпцыю так званага Шагалаўскага квартала, праектам рэканструкцыі якога займаўся славуты беларускі архітэктар Леанід Левін.

У музеі былі б вельмі рады атрымаць будынак для стварэння культурна-асветніцкага філіяла, цэнтра талерантнасці, гісторыі віцебскага і беларускага яўрэйства. Там можна было б адвесці пакой, дзе вернікі маглі б памаліцца...

Пакуль жа неабходна неяк інфармаваць пра аб'ект, напрыклад, усталяваўшы таблічку з тэкстам і фота пра гісторыю сінагогі.

Удзельнікі канферэнцыі прыйшлі да высновы, што наогул трэба вызначыць адказных за тое, каб дарэвалюцыйны будынак далей не разбураўся.

Каля рэшткаў Вялікай Любавіцкай сінагогі самадзейныя артысты выканалі народныя яўрэйскія песні, разыгралі анекдатычную сцэнку з дарэвалюцыйнага жыцця. Мінакі спыняліся і шчыра дзякавалі апладысментамі...

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов (продавец): открытое акционерное общество «Нафтан», 211441, Витебская область, г. Новополоцк; факс +375214598888, тел. +375214598257.

Оператор электронной торговой площадки: ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

Торги проводятся 25.10.2019 на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by. Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

Начальная цена **снижена на 50 %** (информация о предыдущих торгах опубликована в газете «Звязда» от 24.04.2019 № 77 (28944), от 08.06.2019 № 106 (28973) и от 17.08.2019 № 155 (29022)).

№ лота	Наименование предмета торгов; его местонахождение	Краткая характеристика	Начальная цена лота (без учета НДС), бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Примечание
1	Изолированное помещение (инвентарный номер 252/D-92931); Витебская область, г. Новополоцк, ул. Калинина 2А-5	Назначение: помещение бытового обслуживания населения. Количество этажей: 2 (цокольный и подвальный), общая площадь 186,1 кв. м. Фундамент бетонный; стены кирпичные; перегородки: кирпич и плита ДСП; ж/б перекрытия; полы – плитка, бетон. Окна: дерево, ПВХ-профиль, металл. Двери: дерево, ПВХ-профиль. Внутренняя отделка: гипсокартон/пластик, оштукатурено и окрашено. Наружная отделка: оштукатурено и окрашено. Имеется холодное и горячее водоснабжение, канализация, отопление, электроснабжение; естественная вентиляция	29 752,84	1 500,00	В связи с размещением в изолированном помещении, обслуживающих встроенно-пристроенные помещения, приборов учета тепло- и электроэнергии Покупатель обязан предоставлять доступ специалистам Продавца для снятия показаний приборов учета и их обслуживания

Победитель торгов (претендент на покупку) помимо оплаты стоимости предмета торгов оплачивает налог на добавленную стоимость (НДС) по ставке 20 процентов.

Возможно **предоставление рассрочки оплаты стоимости предмета торгов**. Условия предоставления рассрочки приведены в объявлении о проведении электронных торгов на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество».

